Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЛЮТАГА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 26
(26384)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

## ЗЯМЕЛЬНАЕ ПЫТАННЕ ПАТРАБУЕ ЗРАЗУМЕЛАСЦІ І ДАКЛАДНАСЦІ

З пачатку года ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Зямельнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У дакументе шмат чаго новага, што датычыцца зямельных участкаў для жыхароў у блакаваных дамах, аб зямельнай уласнасці для замежнікаў, аб тэрмінах атрымання зямельнай спадчыны, акрэсліваюцца больш гібкія абмежаванні па максімальнай плошчы ўчасткаў для грамадзян і г.д.

**СЁННЯ з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі газеты на ўсе магчымыя пытанні зямельнай тэматыкі і рэгістрацыі нерухомай маёмасці чытачам выдання адкажа **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Георгій Іванавіч КУЗНЯЦОЎ.**

Тэлефоны «прамой лініі» **8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Прамая лінія

## СПРАВЫ САРДЭЧНЫЯ

Гэтай тэме будзе прысвечана наша чарговая «прамая лінія». У ёй прымуць удзел **загадчык інфарктнага аддзялення № 2 10-й мінскай гарадской клінікі Наталля Якаўлеўна ПАЛЯЎКОВА і ўрач-кардыёлаг блока інтэнсіўнай тэрапіі Ірына Віктараўна ГРЫШЫНА.**

**«Прамая лінія» адбудзецца СЁННЯ з 16 да 17 гадзін. Званіце па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Твае правы

# ДАМОВА. ТОЛЬКІ ПОТЫМ ПРАЦА

**Параўнальна высокія заробкі — толькі адзін бок медаля. Другой і не менш важнай асаблівасцю малога бізнэсу традыцыйна з'яўляюцца вышэйшая «планка патрабаванняў» да супрацоўнікаў, а таксама... больш частыя парушэнні працоўнага заканадаўства. Між тым, як уладкавацца да прыватніка і не патрапіць у «пастку»? Каб адказаць на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з намеснікам начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Ірынай Мікалаеўнай КОТАВАЙ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

в. Камянюкі, Камянецкі раён.

### Варыянт — выпрабаванне

Варта заўважыць, што парадак прыёму на працу не залежыць ад формы ўласнасці арганізацыі. Паўсюль прэтэндэнт на вакансію абавязаны падаць пэўны пакет дакументаў — перш-наперш пашпарт і пасведчанне аб адукацыі. Апроч таго, асобы, якія ўладкоўваюцца не ўпершыню і не па сумяшчальніцтве, падаюць працоўную кніжку, інваліды — заключэнне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі, а некаторыя іншыя катэгорыі — яшчэ і дэкларацыю аб даходах.

У сваю чаргу абавязак наймальніка — падпісаць працоўную дамову і выдаць загад аб прыёме. Прычым працоўная дамова павінна мець толькі пісьмовую форму і быць падпісаная як работнікам, так і наймальнікам.

— Часам даводзіцца сустракацца з выпадкамі, калі прэтэндэнту кажуць, маўляў, крыху папрацуй, мы паглядзім на цябе, ты на нас, а потым вырашым усе фармальнасці, — кажа Ірына Котава. — Аднак трэба падкрэсліць, што гэта — недапушчальна. Сітуацыя, калі работнік працуе без афармлення, рызыкуе зацягнуцца, а адсюль могуць узнікнуць праблемы і з выплатай зарплаты, і з адлічэннямі ўзносаў на сацыяльнае страхаванне, інакш кажучы, за гэты час не будзе налічвацца пенсійны стаж. Да таго ж тут нельга забывацца на такі істотны нюанс, як ахова працы.

Калі з'яўляецца прапанова «спачатку пакажы свае здольнасці», ёсць сэнс узгадаць іншы варыянт — выпрабавальны тэрмін. Ён можа працягвацца да трох месяцаў. Праўда, зноў жа трэба памятаць, што тут заканадаўства мае пэўныя абмежаванні. У прыватнасці, выпрабавальны тэрмін нельга вызначыць маладым спецыялістам, інвалідам, работнікам ва ўзросце да 18 гадоў, работнікам, якія прыходзяць пераводам ад аднаго наймальніка да другога, часовым ці сезонным работнікам і г.д. Прычым запіс аб выпрабаванні павінен быць зроблены менавіта ў працоўнай дамове. Калі ж падобны запіс ёсць у іншых лакальных актах, скажам, у загадзе аб прыёме на працу, то лічыцца, што чалавек уладкаваўся без якіх-небудзь «дадатковых умоў».

— Новы работнік павінен дакладна ведаць, на што ён пагаджаецца, таму другі экзэмпляр працоўнай дамовы абавязкова выдаецца «на рукі», — працягвае Ірына Котава. — Прычым да самой працоўнай дамовы ёсць строгія патрабаванні. У ёй павінны быць пазначаны дакладныя назвы бакоў, дакладная, у адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам, назва прафесіі ці пасады, умовы аплаты працы, канкрэтная сума зарплаты на дату заключэння дамовы, канкрэтныя дні выплаты зарплаты, рэжым працы і адпачынку. Апроч таго, работніка неабходна пазнаёміць «пад роспіс» з правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, палажэннем аб аплаце працы, палажэннем аб прэміраванні і іншымі лакальнымі прававымі актамі арганізацыі. Гэта дазволіць пазбегнуць многіх спрэчных момантаў у далейшым.

### Кніжку «адшукае»... дзяржінспектар?

Заканадаўства вызначае: наймальнік абавязаны зрабіць адпаведныя запісы ў працоўнай кніжцы на працягу 5 дзён пасля працаўладкавання і выдаць працоўную кніжку ў дзень звальнення. Не датычыцца гэта патрабаванне толькі адной катэгорыі — сумяшчальнікаў.

— Калі работнік высвятляе, што працоўная кніжка на яго не заведзеная ці ў ёй не робіцца ніякіх запісаў, ён можа звярнуцца ў дзяржінспекцыю працы, — раіць Ірына Котава. — Да слова, пытанне, дзе ўзяць саму працоўную кніжку, несур'ёзнае. Арганізацыі, што маюць ведамасную прыналежнасць, павінны звярнуцца ў сваё міністэрства ці ведамства. А арганізацыі, што ведамаснай прыналежнасці не маюць, атрымліваюць кніжкі ў выканкамах ці ў адміністрацыях раёна па месцы рэгістрацыі.

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

Канферэнц-зала

# П'янага кіроўцу — да 15 гадоў пазбаўлення волі?

**Летась 96 адсоткаў з 272 тысяч чалавек, якія звярнуліся ў беларускія суды, атрымалі рэальную судовую абарону сваіх грамадзянскіх правоў. Было задаволена 65 адсоткаў іскаў аб абароне правоў спажыўцоў, кожны трэці чалавек, якога незаконна звольнілі і які своечасова падаў заяву ў суд, вярнуўся на сваё працоўнае месца. Паводле слоў старшыні Вярхоўнага Суда Беларусі Валянціна СУКАЛЫ, такой колькасці зваротаў яшчэ ні разу не было ў гісторыі Беларусі. Гэта сведчыць пра высокую прававую культуру беларусаў і рост даверу да судоў.**

З-за павелічэння колькасці грамадзянска-прававых спрэчак і адміністрацыйных парушэнняў (сярод іх найбольшую ўдзельную вагу складаюць дробныя хуліганствы, распіццё алкаголю ў грамадскіх месцах, кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане) у 2008 годзе выраслі аб'ёмы правасуддзя. Усё гэта пацягнула за сабой павелічэнне нагрузкі на суддзяў. У месяц кожны суддзя павінен быў разгледзець 7 крымінальных, 30 грамадзянскіх і 38 адміністрацыйных спраў.

У цэлым работа суддзяў прызнана здавальняючай, але не абышлося і без небеспадстаўных нараканняў грамадзян на парушэнне Кодэкса годнасці суддзямі як падчас судовых пасяджэнняў, так і ў побыце. У выніку 4 суддзі пазбаўленыя пасады за грубыя парушэнні патрабаванняў закона і Кодэкса гонару суддзі, да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнуты 94 суддзі.

— Негатыўны момант у рабоце судоў — неабгрунтаванае асуджэнне летась 19 чалавек, — адзначыў Валянцін Сукала. — А ўсё з-за таго, што якасць першапачатковага расследавання па крымінальных справах не заўсёды з'яўляецца паказальнай. Хвалюе і дастаткова некрытычная ацэнка судоў першых інстанцый такой якасці расследавання.

Старшыня Вярхоўнага суда Беларусі паведаміў, што плануецца змякчыць крымінальнае пакаранне ў дачыненні да асобаў, якія здзейснілі не небяспечнае злачынства (88 адсоткаў летась), і зрабіць больш суровым пакаранне за цяжкія карупцыйныя злачынствы і злачынствы з прымяненнем гвалту. Згодна з канцэпцыяй крымінальна-прававой палітыкі на найбліжэйшы час, прынята рашэнне аб шырокай магчымасці прызначэння пакаранняў, не звязаных з пазбаўленнем волі. Штогод у Беларусі плануецца змяншаць колькасць людзей (на 1,5 тысячы), якія будуць накіроўвацца за краты. Цяпер пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі прымяняецца недзе ў 22 адсотках ад усіх прыгавораў, якія выносіць суд. Сёння такая мера пакарання не з'яўляецца пераважнай у структуры крымінальных пакаранняў за ўчыненне няцяжкіх злачынстваў.

У тым выпадку, калі злачынства не звязана з карупцыяй, плануецца даваць магчымасць злачынцу заключаць «здзелкі з правасуддзем». Сума, якую неабходна выплаціць, будзе прызначацца дзяржаўным абвінаваўцам і не перавысіць 60 тысяч долараў.

— Я лічу, што чалавек, які прызнаў віну, павінен мець права выплаціць сацыяльную кампенсацыю. Але толькі суд будзе вырашаць — прымаць да ўвагі падчас вынясення пакарання сацыяльную кампенсацыю, якую ўнёс абвінавачаны, ці не.

Што ж датычыцца сведкаў, то правасуддзе імкнецца абараняць іх на судовых працэсах.

— Цяпер беларускае заканадаўства прадугледжвае 7 спосабаў іх абароны. У многіх судах маюцца спецыяльныя пакоі для бескантактнага допыту. У тым выпадку, калі сведку пагражае небяспека, ён наогул не прысутнічае на судовых пасяджэннях. У нашай краіне не было такога, каб у мэтах захавання бяспекі сведкі мянялі знешнасць.

У 2008 годзе суды максімальна павялічылі адказнасць і штрафы за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане.

— Мы лічым, што неабходна прымяняць і больш суровыя санкцыі ў дачыненні да нецвярозых кіроўцаў, па віне якіх загінулі людзі. Віноўнікам ДТЗ, у выніку якіх загінула 2 і больш людзей, трэба прызначаць пакаранне да 12—15 гадоў пазбаўлення волі. На сёння верхняя мяжа пакарання за такое злачынства складае 7 гадоў.

Прэзідэнт Беларусі звярнуўся да суда з просьбай уважліва паставіцца да справы затрыманых па падазрэнні ў забойстве жыхара вёскі Пухавічы (падазраюцца ў забойстве М. Макарэвіча, які да гэтага быў неаднаразова асуджаны, трое мужчын. Сведкі паведамілі, што пацярпелы напярэдадні смерці ўчыніў у вёсцы некалькі падпалаў. І мясцовыя жыхары вырашылі сваімі рукамі адпомсціць злодзею).

— Да нас пастаянна звяртаюцца людзі з падобнымі просьбамі. Мы іх улічваем падчас вынясення пакарання. Гэта сітуацыя, як з жыццёвага, так і з прававога боку, не вельмі простая. Суд, як толькі разбярэцца з ёй, дасць прынцыповую ацэнку. На стадыі расследавання я не маю права нічога каментаваць, каб не рабіць памылковых і паспешлівых высноў.

**Надзея ДРЫЛА.**

# «Грыпуюць» дванаццаць кантрольных гарадоў

**За апошні тыдзень у 18 кантрольных гарадах на грып і прастуду захварэлі 88 591 чалавек, што на 12,3 працэнта больш, чым на папярэднім тыдні. Па стану на 10 лютага «грыпавалі» ўжо 12 гарадоў (Гродна, Ліда, Брэст, Пінск, Бабруйск, Мінск, Гомель, Барысаў, Салігорск, Наваполацк, Мазыр, Рэчыца) і 41 раён.**

Эпідэмія грыпу рухаецца па краіне з Захаду на Усход. Так, у Магілёўскай вобласці «здаліся» грыпу пакуль толькі жыхары Асіповіцкага раёна, а ў Віцебскай вобласці — Шаркоўшчынскага і Пастаўскага раёнаў. Вучэбны працэс быў спынены ў 94 школах, з адрасам «прапіскі» ў 38 раёнах. Колькасць ахворыхаў прастуды і грыпу дасягнула ўжо 875,5 тысячы чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Махляры «прымяраюць» пагоны

Як нас дураць

**У сталіцы зафіксаваныя выпадкі, калі называючы сябе супрацоўнікамі міліцыі прайдзісветы прапануюць людзям вырашыць станоўча пытанні па лініі ДАІ і «кідаюць» сваіх ахвяраў на грошы.**

Паводле звестак аддзялення інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, з пачатку года ў сталіцы супрацоўнікі 3-га ўпраўлення Галоўнага ўпраўлення асабістай бяспекі МУС выявілі ўжо два падобныя факты: у абодвух выпадках злачынцы падбухторвалі прасякоў да дачы хабару. Нахабнікі пад выглядам супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі (менавіта так яны называліся пацярпелым) літаральна садзіліся на шыю да сваіх ахвяраў, гаворачы, што за пэўную плату вырашаць любое пытанне. А вось калі грошы траплялі ў кішэню да зладзюжак, «запал» апошніх адразу сыходзіў на не: яны альбо знікалі, альбо не спяшаліся дапамагаць.

У адным выпадку на вуду да махляра трапіў 48-гадовы мінчанін, якога яшчэ з верасня мінулага года «церабіў» нейкі дабрадзей. Ілжэсупрацоўнік ДАІ прапаноўваў мужчыну дапамагчы ў абыходзе закона з атрыманнем вадзіцельскага пасведчання яго 23-гадовай дачцэ. Вада і камень точыць: не вытрымаў і клапатлівы бацька і заплаціў падбухторшчыку 450 долараў ЗША. Аднак, як высветлілася, дарэмна выкінуў грошы на вецер, таму што правоў яго дачка так і не дачакалася ад паслужлівага памагатага. Падмануты ж чалавек быў вымушаны звярнуцца ў міліцыю, супрацоўнікі якой хутка ўстанавілі асобу злымысніка. А ім аказаўся 28-гадовы нідзе непрацуючы мінчанін, які жыў у інтэрнаце. Ён затрыманы і змешчаны ў ізалятар, а па факце ўзбуджана крымінальная справа.

Яшчэ аднаго прасцяка іншы прайдзісвет адшукаў у будынку раённай ДАІ Мінска. Аб'явіўшы сябе супрацоўнікам раённай ДАІ, злымыснік заявіў пацярпеламу, што гатовы дапамагчы яму са здачай экзамена на атрыманне вадзіцельскага пасведчання. Ды і грошы за гэта запрасіў параўнальна невялікія — 100 долараў ЗША. Калі згаданая сума была ў руках злачынцы, які, зразумела ж, не працаваў у міліцыі, яго і затрымалі.

Каментуючы вышэйзгаданыя выпадкі махлярства, начальнік 3-га ўпраўлення ГУУБ МУС Беларусі маёр міліцыі Віталь Кісцерны адзначыў, што масавага характару яны не набылі, аднак людзям заўсёды трэба насцярожана ставіцца да падобнага роду прапаноў. Да таго ж ён падкрэсліў, што жаданне атрымаць тую ці іншую выгоду ў абыход вызначаных правілаў ідзе ў разрэз з законам, што можа прывесці да прыцягнення да крымінальнай адказнасці. Акрамя гэтага, звяртаючыся да «паслуг» падобных «дабрадзеяў», чалавек становіцца ахвярай махлярства, а шанцы вярнуць свае грошы — практычна роўныя нулю.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# Браканьеры кінулі тушы і аўто

**Работнікам Магілёўскай аблінспекцыі паведамілі пра стрэлы паблізу вёскі Старая Каменка Слаўгарадскага раёна. Рэйдавая група дзяржінспектараў знайшла дзве тушы дзікоў, сляды паляўнічых і трох паляўнічых сабак.**

Для затрымання парушальнікаў былі задзейнічаны дзяржінспектары Касцюковіцкай міжрайінспекцыі, супрацоўнікі Слаўгарадскага і Краснапольскага РАУС, лясная ахова Краснапольскага лясгаса і егеры Слаўгарадскай раённай структуры Таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Была знойдзена яшчэ адна кінутая туша казулі і аўтамабіль «Ніва», што належаў жыхару Шклоўскага раёна. Сляды паляўнічых і сабак вялі ад кінутай машыны да ракі Сож, праз якую і пераправіліся мяркуемыя правапарушальнікі. Тушы дзікоў, казулі і аўтамабіль канфіскаваны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## ДЫРЫЖОР ВАЕННАГА АРКЕСТРА ЗБЫВАЎ НАРКОТЫКІ

**Асіповіцкі РАУС распачаў крымінальную справу ў дачыненні да капітана, ваеннага дырыжора адной з вайсковых часцей за захоўванне і рэалізацыю наркатычных рэчываў.**

Паводле паведамлення аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама, 30-гадовы вайсковец па месцы жыхарства 4 лютага прадаў 0,4 грама амфетаміну. Праз некалькі дзён пры вобыску ў яго пакоі ў афіцэрскім інтэрнаце знайшлі 10 грамаў амфетаміну. Яшчэ адна крымінальная справа распачата ў дачыненні да 26-гадовага камандзіра батарэі той жа вайсковай часці, які рэалізаваў больш за грам марыхуаны.

**Алена КАЗЛОВА.**

## СЕМ'І МІНЧАН, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ Ў АФГАНІСТАНЕ, АТРЫМАЮЦЬ АДНАРАЗОВУЮ ГРАШОВУЮ ДАПАМОГУ

Да 15 лютага, да дня вываду савецкіх войскаў з Рэспублікі Афганістан, з гарадскога бюджэту ім выплацяць па 150 тысяч рублёў. Гарадской праграмай адраснай сацыяльнай дапамогі на 2009 год прадугледжана і іншая дапамога сем'ям воінаў-інтэрнацыяналістаў. Як расказалі ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, сем'ям загінулых у той вайне дапамогуць і з рамонтам надмагільных помнікаў воінам-афганцам.

**Вольга ШАЎЧУК, «Мінск—Навіны».**

## ІНФЛЯЦЫЯ Ў СТУДЗЕНІ — 4,1 ПРАЦЭНТА

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. У студзені 2008 года яна складала 2,5 працэнта.

Індэкс спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі ў студзені 2009 года да студзеня 2008 года склаў 115,1 працэнта.

У 2008 годзе інфляцыя ў Беларусі была 13,3 працэнта.

## РТУЦЬ ПАД НАГАМІ

Позна вечарам на міліцэйскі пульт паступіла паведамленне пра тое, што на адной з вуліц Гомеля валяецца цэлафанавы пакет з рэчывам, падобным на ртуць. Абясшкоджваць небяспечную знаходку выехалі супрацоўнікі ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. Факт пацвердзіўся: каля 150 грамаў ртуці дастаўлена на захаванне ў пажарны аварыйна-выратавальны атрад, а міліцыя цяпер шукае былых уладальнікаў рэчыва.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НЕ ВЯРНУЎСЯ З ЦЕПЛАТРАСЫ

**Жыхар аднаго з дамоў па вул. Кірава ў Баранавічах пайшоў у размеркавальнае памяшканне цеплатрасы і не вярнуўся адтуль.**

Калі ж на цеплатрасе прарвала трубы, то работнікі камунальнай службы вырашылі перакрыць падачу вады. Зайшлі ў памяшканне і ўбачылі труп мужчыны. Праверку праводзіць пракуратура горада.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Антыкрызісная эканоміка

# «Славянка» дыктуе моду і цэны

**Бабруйская ААТ «Славянка» прадэманструе сваю новую вясновую калекцыю на міжнароднай выставе-кірмашы тэкстыльнай прамысловасці, якая адкрываецца 15 лютага ў Маскве.**

Бабруйскія тэкстыльшчыкі два разы на год дэманструюць у расійскай сталіцы свае навінкі: паліто, курткі, плашчы, а таксама спартыўную калекцыю, якая карыстаецца вялікім попытам. Сучасныя тканіны і ідэі мадэльераў спалучаюцца ў новай прадукцыі па прымальных цэнах.

— Мы павінны разам ісці па крызісным шляху, саступаючы адно аднаму, — вобразна сказаў дырэктар «Славянкі» Тэймураз Бачарышвілі. — Я маю на ўвазе трыумвірат: пастаўшчыкі, вытворцы і пакупнікі.

Кіраўнік прадпрыемства паведаміў, што ўдалося дамагчыся ад пастаўшчыкоў паніжэння цэнаў на сыравіну. Прадукцыя «Славянкі» таксама не падаражэла, і гэта ацанілі пакупнікі.

ААТ «Славянка» вырабіла за сёлетні студзень прадукцыі на 8,8 % больш за мінулагодні ўзровень. І хаця вялікіх дасягненняў у эканамічнай эфектыўнасці першы месяц гэтага года не прынёс, на прадпрыемстве лічаць, што цяпер галоўнае — выжыць і працаваць.

На «Славянцы» сёння працуюць 1700 чалавек, у тым ліку 35 чалавек у цэху па пашыве школьнай формы ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна. Сярэдні заробак складае каля 600 тысяч рублёў. Тэймураз Бачарышвілі заявіў, што ў адкрытым акцыянерным таварыстве не будзе скарачэння ні работнікаў, ні працоўнага тыдня.

**Ілона ІВАНОВА.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ**

**по продаже:**

- изолированного 3-этажного помещения пл. 379,8 кв.м, г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7;
- цеха спецметаллоконструкций (7204,4 кв.м) и бетонированной площадки (4882 кв.м), Пуховичский район, г.п. Свислочь, промплощадка Минской ТЭЦ-5 (имеется ж/д ветка);
- складского комплекса: Борисовский р-н, д. Ланковщина (а/т Москва—Брест, ст. Новосады) в т.ч.: склад (9929,8 кв.м), АБК (798 кв.м), мехмастерская (125 кв.м) и др. Имеется ж/д ветка.
- здания склада (341 кв.м) в г. Жодино, ул. Труда, 8.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЫБУХІ Ў КАБУЛЕ

**У выніку выбухаў на поўначы сталіцы Афганістана, якія здзейснілі двое тэрарыстаў-смяротнікаў, загінулі да васьмі чалавек. Адказнасць за тэракт узялі на сябе баевікі руху «Талібан».**



Мэтай тэракту быў урадавы будынак, у якім размяшчаецца турэмная адміністрацыя. Адзін з нападнікаў адкрыў агонь па ахоўніку каля варот. Замацаваны на другім тэрарысце выбуховы зарад спрацаваў каля галоўнага ўваходу. Яшчэ адзін тэрарыст-смяротнік быў застрэлены паліцыяй каля будынка міністэрства адукацыі, выбуху не адбылося і ў будынку міністэрства юстыцыі паліцэйскія таксама застрэлілі двух тэрарыстаў.

### У ПАР «ПАХАВАЛІ» БУША

**Паўднёваафрыканскі інфармацыйны тэлеканал ETV News памылкова размясціў у бягучым радку навінаў паведамленне пра тое, што былы прэзідэнт ЗША Джордж Буш-малодшы памёр.**

Як высветлілася пазней, такое паведамленне было прызначана для тэхнічнага тэставання і яго выпадкова запусцілі ў эфір па просьбе аднаго з кіраўнікоў тэлеканала, які пажадаў паглядзець, як выглядае бягучы радок.

### ВА УКРАІНЕ НЕ ВЫПЛАЧВАЮЦЬ СТЫПЕНДЫЮ

**У большасці ўкраінскіх ВНУ студэнты, якія маюць права на атрыманне стыпендыі, грошай за студзень не атрымалі.**

Мноства студэнтаў, у якіх сярэдні бал апошняй сесіі 4.0 і вышэйшы (ва Украіне гэта дае права на атрыманне мінімальнай стыпендыі), засталіся без грошай. Прычым паведамленні пра нявыплаты сталі прыходзіць з усіх рэгіёнаў краіны. Акрамя гэтага многія студэнты сутыкнуліся з тым, што ВНУ самастойна завышаюць патрабаванні па акадэмічнай паспяховасці студэнтаў, якія прэтэндуюць на стыпендыі.

### УРАГАН У ЗША

**Ураган у цэнтральнай частцы ЗША прывёў да гібелі як мінімум 15 чалавек.**

Магутны тарнада прайшоў увечары ў аўторак праз невялікі горад Лаун-Граўв (Аклахома). Многія будынкі разбураныя. Тарнада пакінуў у цэнтры горада паласу разбурэнняў шырынёй каля 1,6 кіламетра. Колькасць зніклых без вестак вылічаецца дзясяткамі чалавек. Пашкоджанні будынкаў і ліній электрапередач з-за ўрагану і моцнага ветру адзначаныя ў Аклахома-Сіці, яго прыгарадах, а таксама ў заходняй частцы суседняга штата Тэхас.

### АМЕРЫКАНСКІЯ САЛДАТЫ ПАТАЎСЦЕЛІ

**Колькасць амерыканскіх вайскоўцаў, якія пакутуюць ад залішняй вагі і атлусцення, удвая выросла пасля пачатку іракскай кампаніі ў 2003 годзе.**

У 1998 годзе колькасць поўных вайскоўцаў складала 25,6 тысячы чалавек, гэта значыць 1,6 працэнта складу ўзброеных сілаў. У 2003 годзе паказчык вырас да 34,3 тысячы (2,1 працэнта), а ў 2008 — да 68,7 тысячы (4,4 працэнта). Падчас праведзенага ў 2005 годзе апытання вайскоўцы назвалі стрэс, звязаны са знаходжаннем у зоне канфлікту і наступным вяртаннем, галоўнай прычынай хуткага набору вагі.

### СУСВЕТНЫ КРЫЗІС: У КРЭДЫТ І ФУТБАЛІСТЫ

Мадрыдскі «Рэал» возьме буйны крэдыт на набыццё атакуючага паўабаронцы «Манчэстэр Юнайтэд» і зборнай Партугаліі, уладальніка «Залатога мяча» і прыза лепшаму гульцу свету ФІФА Крышціяну Раналду. Кіраўніцтва банка Banco Santander ужо дало згоду задаволіць запыт мадрыдскага клуба аб крэдыце на суму 70 мільёнаў еўра.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.02.2009 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 795,00 |
| 1 еўра | 3 624,84 |
| 1 латвійскі лат | 5 150,18 |
| 1 літоўскі літ | 1 049,61 |
| 1 чэшская крона | 126,96 |
| 1 польскі злоты | 799,23 |
| 1 расійскі рубель | 78,00 |
| 1 украінская грыўня | 342,73 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 35,8323 |
| 10 UAH | 46,3312 |
| 1000 BYR | 12,8156 |
| EUR | 44,6508 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

# КОЖНАМУ БЕЛАРУСУ ПА 6 КНІЖАК!

**XVI Мінская міжнародная выстава-кірмаш «Кнігі Беларусі-2009» адкрылася ўчора ў выставачным павільёне «Белэкспа». Па словах міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча, сёлета беларусам ёсць што паказаць і чым пахваліцца.**

— Кнігавыданнем у нас займаецца болей за 700 выдаўцоў, а летась мы выпусцілі каля 6 экзэмпляраў кніг і брашур на кожнага жыхара краіны. Гэта добры паказчык, — лічыць міністр інфармацыі. — Я з задавальненнем адзначаю, што і паліграфічнае афармленне нашай прадукцыі паляпшаецца з кожным годам. І наогул, мы перакананыя, што 16-я выстава-кірмаш «Кнігі Беларусі-2009» будзе служыць збліжэнню народаў, культур, прапагандзе кнігавыдання і кнігі.

Сёлета на кніжнай выставе пачэсным госцем выступае Рэспубліка Казахстан. Кіраўнік казахстанскай дэлегацыі, старшыня Камітэта інфармацыі і архіваў Міністэрства культуры і інфармацыі Рэспублікі Казахстан, Бауржан Айтказін падзяліўся сваімі думкамі наконт таго, як звязаны кнігавыдавецтва і фінансавы крызіс.

— Сусветны эканамічны крызіс пераможна ідзе па планеце, — адзначыў ён, — абвальваюцца эканомікі, скарачаюцца працоўныя месцы, стаяць вытворчасці...

**Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір РУСАКЕВІЧ і старшыня Камітэта інфармацыі і архіваў Міністэрства культуры і інфармацыі Рэспублікі Казахстан, Бауржан АЙТКАЗІН на выставе.**

І вось у гэтых няпростых, складаных умовах правядзенне найбуйнейшай Мінскай міжнароднай выставы — гэта сапраўды дастойны адказ пагрозам і выклікам часу. І таму, пакуль ёсць такая міжнародная выручка кнігавыдаўцоў, я думаю, крызісу ў чалавечых душах не будзе.

Пасля таго, як кіраўніка казахстанскай дэлегацыі азнаёмілі з асноўнымі стэндамі выставы, Бауржан Айтказін сказаў колькі словаў пра сяброўства нашых народаў:

— У Казахстане цяпер звыклая карціна, калі на нашых нівах — вашы камбайны, на нашых вугальных шахтах — вашы БелАЗы і МАЗы. Я ведаю, што казахстанскае зерне вельмі папулярнае ў Беларусі, што нашы банкі актыўна працуюць у вас. І вось тое, што цяпер Казахстан актыўна ўдзельнічае ў гэтай кніжнай выставе, мы схільныя разглядаць як яшчэ адзін крок да збліжэння дзвюх краін.

Нагадаем чытачам, што кніжная выстава будзе працаваць да 15 лютага. На ёй вы зможаце пабачыць стэнды з кнігамі 25 краін — Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы, Польшчы, Славакіі, Францыі, Швецыі, Германіі, Ізраіля, Кітая, Кубы, ЗША, Эстоніі, Балгарыі, Бельгіі, Венгрыі, Ірана, Карэі і іншых. І вядома ж — стэнды беларускіх выдаўцоў, дзе можна не толькі кніжкі пагартаць-набыць, але і падсілкавацца: напрыклад, выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі» на адкрыцці выставы частавала ўсіх ахвотных блінамі. Чаму блінамі? Усё проста: яны ў 2008-м выпусцілі добрую кніжку «Беларуская кухня» і, відаць, не ўтрымаліся пару рэцэпцікаў выкарыстаць і пакарміць чытачоў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**
**Фота аўтара і БЕЛТА.**

Казахі прэзентавалі свае кнігі з песнямі.

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЎЗНАГАРОДЗІЎ МЕДАЛЁМ «ЗА БЕЗДАКОРНУЮ СЛУЖБУ» I, II, III СТУПЕНЯЎ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ КРАІНЫ

За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступеняў ваеннаслужачых краіны. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 6 лютага.

У прыватнасці, медалём «За бездакорную службу» I ступені адзначаны палкоўнік Яўген Бандаровіч, палкоўнік Якаў Баннікаў, падпалкоўнік Дзмітрый Кажамякін, генерал-маёр Генадзь Казакоў, палкоўнік Валерый Кучаеў, палкоўнік Сяргей Патапаў, падпалкоўнік Міхаіл Русін.

## ПРЭЗІДЭНТ ПАВІНШАВАЎ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЦЫРКА З 50-ГОДДЗЕМ

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што стварэнне першага ў гісторыі нацыянальнага цыркавога калектыву стала значнай падзеяй у культурным жыцці краіны. Яго артысты зачароўваюць юных і дарослых гледачоў сваім талентам, творчай фантазіяй і прафесіяналізмам, вядуць актыўную дабрачынную дзейнасць, паспяхова выступаюць на міжнародных фестывалях і конкурсах, праслаўляюць нашу Радзіму ва ўсім свеце.

Прэзідэнт пажадаў калектыву цырка, каб яго згуртаваная каманда сяброў і аднадумцаў і надалей працавала з такім жа энтузіязмам і самаадданасцю, радавала прыхільнікаў новымі цудоўнымі праграмамі і дарыла людзям выдатны настрой.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ПРЭЗІДЭНТА ІРАНА З 30-Й ГАДАВІНАЙ ІСЛАМСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран Махмуда Ахмадзінежада з нацыянальным святам — 30-й гадавінай Ісламскай рэвалюцыі.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў імкненне Беларусі да развіцця супрацоўніцтва з Іранам ва ўсіх сферах.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Гандлю — зялёнае святло

**Чакаецца, што пагадненне паміж Беларуссю і Сербіяй дазволіць павялічыць аб'ём узаемнага таваразвароту.**

Пакуль што аб'ём таваразвароту паміж Беларуссю і Сербіяй, мякка кажучы, — сціплы. Летась ён склаў 32,5 млн еўра (пры гэтым экспарт беларускага боку перавысіў імпарт больш як на 11 млн). Сітуацыю павінна палепшыць пагадненне аб свабодным гандлі паміж дзвюма дзяржавамі. Яго плануецца падпісаць у сакавіку, паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі пасол Сербіі ў Беларусі Срэчка Джукіч. Сёння размова ідзе пра пагадненне, якое ўлічвае правілы Сусветнай гандлёвай арганізацыі і рэкамендацыі Еўрасаюза — такая была агульная выснова бакоў. Пасол задаволены тым, што пералік тавараў, выключаных са свабоднага гандлю, вельмі невялікі. У канцы наступнага месяца чакаецца таксама падпісанне пагаднення аб працоўнай міграцыі, ёсць і напрацоўкі па пагадненні аб сацыяльным забеспячэнні і ахове здароўя.

Статус Косава і Метохіі застаецца палітычнай праблемай нумар адзін для Сербіі. Дыпламат запэўніў, што косаўскае пытанне трэба вырашаць мірным шляхам. «Гэта, вядома ж, вельмі доўгая барацьба, але мы перакананыя, што яна прынясе плён», — адзначыў спадар Джукіч. Ён падкрэсліў імкненне сербскага боку, каб перамовы па праблемах Косава і Метохіі аднавіліся пад эгідай ААН, а таксама жаданне захаваць сваю тэрыторыю. Дыпламат зрабіў акцэнт на тым, што сербскі бок паважае пазіцыю албанцаў, аднак мяркуе, што яны не могуць будаваць дзяржаўнасць на сербскай зямлі. На думку пасла, няма такой краіны, дзе нельга было б распаліць агню міжнацыянальнай розні і... стварыць «косава». «Працэс «касавізацыі» трэба спыніць», — упэўнены дыпламат. Ён прывёў падлікі спецыялістаў, згодна з якімі «касавізацыя» ў недалёкай перспектыве можа, як мінімум, падвоіць (!) колькасць існуючых дзяржаў (калі ўжо праз паўгода дзве новыя дзяржавы заявілі пра сваю незалежнасць). «Трэба асэнсоўваць усе гэтыя працэсы, і прыводзіць іх у рэчышча палітычнага ўрэгулявання», — рэзюмаваў пасол.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## БАНКІ І АЎТАКАМПАНІІ: КАРЭКЦЫЯ ПЛАНАЎ

**Сусветны крызіс уносіць свае карэктывы ў дзейнасць многіх фірмаў і арганізацый, якія працуюць на беларускім рынку.**

Пэўна, што эфектыўнасць банкаўскіх структур у цяперашніх рэаліях можна ацаніць па рабоце ЗАТ Банк ВТБ (у нядаўнім мінулым — «Слаўнафтабанк»), які гэтымі днямі падвёў вынікі сваёй дзейнасці за 2008 год і паведаміў пра планы на найбліжэйшую перспектыву.

Паводле слоў старшыні праўлення ЗАТ «ВТБ Банк» Уладзіміра Іванова, мінулы год для іх установы, якая працуе на беларускім рынку з 1996 года, можна назваць дынамічным і маштабным у развіцці, калі не лічыць 4-га квартала. Тым не менш, нягледзячы на крызіс, ЗАТ «Банк ВТБ» выканаў усе прагнозныя паказчыкі і нават змог развіць філіяльную сетку практычна ва ўсіх абласных гарадах і ў найбольш буйных раённых цэнтрах.

Праўда, негатыўныя падзеі, якія адбываюцца апошнім часам на эканамічных рынках суседніх дзяржаў і Еўропы ў цэлым і дасягнулі Беларусі, прымушаюць банкіраў карэктаваць планы на найбліжэйшы час. У прыватнасці, гэта датычыцца ўкладаў ад фізічных і юрыдычных асобаў, а таксама выдачы крэдытаў.

Да нядаўняга часу Банк ВТБ прапаноўваў насельніцтву вельмі прывабліывя ўмовы аўтамабільнага крэдытавання. Цяпер жа, зазначыў кіраўнік банка, верагодней за ўсё давядзецца перагледзець гэты спектр паслуг, бо крэдытаванне на аўто робіцца ў беларускіх рублях. Тым не менш, падкрэсліў Уладзімір Іваноў, «стратэгічнай задачай банка на найбліжэйшы год будзе захаванне нашай долі і месца на рынку».

Прыкладна такую ж задачу паставіў перад сабой і афіцыйны прадстаўнік Mazda і Land Rover. Паводле слоў дырэктара прадстаўніцтва Аляксандра Скалубовіча, год вызначаўся добрай дынамікай і пазітыўнымі зменамі на аўтамабільным рынку краіны, за выключэннем апошніх некалькіх месяцаў. Канец года вызначыўся змяншэннем пакупніцкай здольнасці насельніцтва, у тым ліку і па аўтакрэдытаванні.

Цяпер, падкрэсліў спадар Скалубовіч, няпросты час і ў тым ліку і для вядзення аўтамабільнага бізнэсу, тым больш што большасць суветных аўтаканцэрнаў павысілі цэны для скарачэння фінансавага разрыву ва ўмовах высокай няўстойкі вытворчасці на фоне зніжэння продажаў. Праўда, афіцыйны прадстаўнік Mazda і Land Rover у Беларусі, ідучы насустрач беларускаму спажыўцу, захоўвае кошт новых аўто Mazda на ранейшым узроўні. «Наша кампанія, — падкрэсліў Аляксандр Скалубовіч, — моцны і паважаны ігрок на аўтамабільным рынку Беларусі. Свой статус мы заваявалі, перш за ўсё таму, што нясём адказнасць за аўтамабіль кліента і якасць выкананых работ».

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

**ОАО «Управление механизации № 79»**

**извещает своих акционеров о проведении 20 марта 2009 года очередного собрания акционеров.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2008 году и основных направлениях деятельности Общества в 2009 году.
*Докладчик: Директор Общества С.Ф. Старосветов.*
2. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
*Докладчик: главный бухгалтер Е.М. Супрун.*
3. О распределении чистой прибыли за 2008 год, выплате дивидендов за 2008 г., утверждение использования чистой прибыли Общества на 2009 г.
*Докладчик: главный бухгалтер Е.М. Супрун.*
4. Отчет Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии о работе в 2008 г.
*Докладчики: председатель Наблюдательного совета С.И. Плавинская, председатель Ревизионной комиссии О.Т. Будревич.*
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
*Докладчик: зам. директора по экономике А.А. Щуцкий.*
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
*Докладчик: директор Общества С.В. Старосветов.*
7. Об оказании Обществом в 2009 г. — I квартале безвозмездной (спонсорской) помощи.
*Докладчик: юрисконсульт по ВЭД Л.В. Хатько.*
8. О внесении изменений в Устав Общества.
*Докладчик: юрисконсульт по ВЭД Л.В. Хатько.*

**Место проведения собрания:** Дворец молодежи и школьников «Орион» (г. Минск, ул. Бачило, 1, м-н Шабаны).
**Время начала собрания:** 17 часов 15 минут.
**Время регистрации участников собрания:** в день проведения собрания с 15.30 до 17.00 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — и доверенности.

УНН 100090613. **Наблюдательный совет.**

# ДАМОВА. ТОЛЬКІ ПОТЫМ ПРАЦА

**Твае правы**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Абавязкі не «са столі»

Як вядома, кожны работнік мае пэўнае кола абавязкаў. Прычым, і ў тым ліку ў прыватным сектары, вызначаюцца яны не «са столі». Прыкладны пералік абавязкаў утрымлівае Адзіны тарыфна-кваліфікацыйны даведнік работ і прафесій рабочых і Кваліфікацыйны даведнік пасад служачых. Гэтыя даведнікі абавязковыя для ўсіх арганізацый, незалежна ад формы іх уласнасці.

— Вядома, у нечым наймальнік можа адысці ад даведнікаў — скараціць або пашырыць вызначаныя тут абавязкі, — распавядае Ірына Котава. — Аднак любыя змяненні павінны стасавацца са спецыяльнасцю ці адукацыяй работніка. Скажам, даручаць бухгалтару паралельнае выкананне тых жа рамонтных работ немагчыма.

### Зважай на тарыфную сетку

Таксама непрымальны «адвольны парадак» і пры вызначэнні зарплаты. Кожная прафесія ці пасада (яшчэ раз узгадаем пра неабходнасць дакладнасці іх назваў) адпавядае пэўнаму тарыфнаму разраду і тарыфнаму каэфіцыенту Адзінай тарыфнай сеткі. І для вызначэння аплаты працы тарыфны каэфіцыент памнажаецца на тарыфную стаўку I разраду арганізацыі.

Тарыфныя стаўкі ў кожнай арганізацыі, якая не з'яўляецца бюджэтнай і не карыстаецца датацыямі з бюджэту, могуць быць абсалютна рознымі. Тарыфных ставак можа быць нават некалькі. Аднак трэба падкрэсліць: грэбаваць Адзінай тарыфнай сеткай ні дзяржаўныя, ні недзяржаўныя суб'екты гаспадарання не маюць права.

— Наймальнік можа вызначаць формы, сістэмы і памеры аплаты працы па ўласным меркаванні, — адзначае Ірына Котава. — Разам з тым зарплата павінна мець пэўную тарыфную, фіксаваную частку. Адпаведна, плаціць работніку толькі працэнты ад здзелак нельга.

І яшчэ. Трэба памятаць, што работнік, які заняты поўны дзень і выконвае нормы, пры звычайным рэжыме не можа атрымліваць менш чым мінімальную зарплату. «Мінімалка» на сёння — гэта 229.700 рублёў.

### За затрымку зарплаты плацяць грошы

Тэрміны выплаты зарплаты вызначаюцца ў працоўнай, калектыўнай дамове, дамове з банкам ці ў загадзе наймальніка. Прычым тут не можа быць якіх-небудзь разліковых перыядаў — дні ўказваюцца канкрэтна.

Варта мець на ўвазе, што крайні з магчымых «разліковых тэрмінаў» — 25 дзень наступнага месяца. Дарэчы, калі па тых ці іншых прычынах работнікі бачаць свае грошы толькі пасля 30 дня наступнага месяца, наймальнік абавязаны праіндэксаваць нявыплачаную частку з улікам інфляцыі.

### У крайнім выпадку «падмена»

Звычайная працягласць змены складае 8 гадзін. Часам яна можа павялічвацца да 12 гадзін. І толькі некаторым катэгорыям работнікаў дазваляецца працаваць больш.

Прычым пры зменным рэжыме работы заканадаўства дакладна вызначае: час ад заканчэння да пачатку работы не можа быць меншым за працягласць дзвюх змен. А перапынак на абед можа вагацца ад 20 мінут да 2 гадзін.

— Ёсць выпадкі, калі арганізаваць харчаванне немагчыма — тады, на падставе працоўнай дамовы ці правілаў унутранага працоўнага распарадку, перапынак на абед уключаецца ў працоўны час, — зазначае Ірына Котава. — Аднак само па сабе гэта не пазбаўляе наймальніка абавязку наладзіць харчаванне і адпачынак — пакуль ён працягваецца, работніка павінен падмяніць нехта з калегаў.

### Што страціць працаголік...

Працягласць працоўнага водпуску складае як мінімум 24 каляндарныя дні. Калі работнік працуе па кантракце, яму абавязаны даць прынамсі яшчэ адзін дзень да адпачынку. Плюс да таго, існуюць варыянты іншых надбавак — за ненармаваны дзень ці за шкодныя ўмовы.

— Наймальнік абавязаны даваць працоўны водпуск кожны працоўны год, — заўважае Ірына Котава. — І толькі ў выключных выпадках, паводле дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам, частка водпуску можа быць перанесена на год наступны або заменена на грашовую кампенсацыю (за выключэннем 21 каляндарнага дня — іх работнік павінен менавіта «адгуляць»). Але пры гэтым заканадаўства забараняе перанос і кампенсацыю водпускаў асобам ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама водпускаў за шкодныя ўмовы.

Між тым, даволі распаўсюджаная ў прыватных арганізацыях сітуацыя — адмова ад выхаду ў водпуск... самога работніка. Якімі могуць быць наступствы?

— Калі наймальнік склаў графік водпускаў, за 15 дзён да вызначанай даты папярэдзіў аб пачатку адпачынку, за 1-2 дні прапанаваў адпускныя, а работнік пакідаць сваё месца адмовіўся, то такі работнік у бягучым годзе права на працоўны водпуск страчвае і, адпаведна, страчвае права на адпускныя і кампенсацыю, — тлумачыць Ірына Котава. — Надалей жа свой страчаны водпуск такі работнік зможа атрымаць толькі ў выглядзе кампенсацыі і толькі пры звальненні.

### Галоўнае — страхоўка

Таксама тыповая з'ява ў прыватных фірмах — адмова ад выхаду на «бальнічны». З тым, каб «не падставіць» кіраўніцтва... Зрэшты, турбавацца тут не трэба. Наймальнік сапраўды будзе павінен аплаціць «бальнічны лісток». Аднак затым гэтыя выдаткі яму кампенсуе Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Праўда, пры адной вельмі істотнай умове — за работніка павінны рабіцца адлічэнні на сацыяльнае страхаванне. Прычым праверыць выплату страхавых узносаў кожны можа сам — для гэтага неабходна звярнуцца ў мясцовае аддзяленне Фонда.

**Сяргей ГРЫБ.**

**Кватэрнае пытанне**

# РЭГІСТРАЦЫЯ — НЕ ПРОСТА ШТАМП

***Мая стрыечная сястра жыве на Магілёўшчыне. У Мінску ва ўніверсітэце вучыцца яе ўнучка, якую радня вельмі хоча прапісаць (зарэгістраваць) у сталіцы. Пазванілі мне, папрасілі. Метры «лішнія», як быццам ёсць. Але згадзіцца неяк страшнавата: не ведаю, чым гэта можа скончыцца? Калі ласка, напішыце.***

**А. Казак,** *г. Мінск.*

Усяленне каго-небудзь у сваё жылое памяшканне (і наступная рэгістрацыя ўселеных па месцы жыхарства) — гэта вельмі адказная справа.

Усяленне ўнучкі стрыечнай сястры на «свабодныя» метры ў кватэру ўласніка магчыма з афармленнем адпаведнага дагавора найму жылога памяшкання. Пасля з гэтым дагаворам уласнік павінен звярнуцца ў падатковую інспекцыю па месцы пастаяннага жыхарства і зарэгістравацца ў якасці падаткаплацельшчыка. З гэтага моманту ўласнік абавязаны плаціць падатак па вызначанай стаўцы.

Неабходна мець на ўвазе, што ўселены ў кватэру (і зарэгістраваны па гэтым месцы жыхарства) наймальнік таксама мае права ўсяляць у нанятае ім жылое памяшканне незалежна ад згоды ўласніка-наймадаўца сваіх няпоўнагадовых дзяцей. Усяленне іншых грамадзян у займаемае ім жылое памяшканне дапускаецца толькі са згоды наймадаўца і непаўналетніх членаў сям'і, якія пражываюць сумесна з наймальнікам. Наймальнік жылога памяшкання можа ажыццяўляць іншыя правы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Важна таксама ведаць, што ўселены «кватарант» можа ў прынцыпе стаць членам сям'і ўласніка на падставе арт. 29 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Гэтым артыкулам вызначана, у прыватнасці, што да членаў сям'і ўласніка жылога памяшкання адносяцца муж (жонка), іх дзеці і бацькі. Да іх могуць быць аднесены і іншыя сваякі, а таксама непаўналетнія ўтрыманцы, калі яны пражываюць сумесна з ім і вядуць агульную гаспадарку. Іншыя грамадзяне, якія пражываюць не менш за тры гадоў сумесна з уласнікам жылога памяшкання і вядуць з ім агульную гаспадарку, таксама могуць быць прызнаны ў судовым парадку членамі сям'і гэтага ўласніка жылога памяшкання.

У адпаведнасці з арт. 36 ЖК скасаванне дагавора найму жылога памяшкання магчыма па згодзе бакоў, а таксама па патрабаванні аднаго з бакоў у выпадку парушэння іншым бокам істотных умоў дагавора і па іншых падставах, прадугледжаных Кодэксам.

Разам з тым, згодна з законам, ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жылля. Таму скасаванне дагавора найму і высяленне грамадзян у аднабаковым парадку дапускаецца толькі ў судовым парадку і пры наяўнасці вызначаных законам падстаў (напрыклад, пры ўхіленні наймальніка ад платы за карыстанне жыллём і камунальныя паслугі, згодна з арт. 39 ЖК — пры парушэнні правілаў карыстання жылым памяшканнем).

**Віктар САВІЦКІ.**

## ТУТ ЦЯЛЯ, ТАМ АВЕЧКІ, А ФІНАЛ АДЗІН

**На ферме каля в. Борысы Брэсцкага раёна дзверы не былі на замку, і гэтую сітуацыю выкарыстаў жыхар гэтай жа вёскі, якога ўжо судзілі за крадзеж.**

Ён ціха зайшоў на ферму і ўкраў адтуль цяля, якое міліцыя ў яго і знайшла. Гэтым жа вечарам трое жыхароў в. Пелішча Камянецкага раёна спрабавалі ўкрасці з фермы «Агра-Пелішча» тры авечкі. Убачыўшы, што аперацыя правалілася, зладзеі кінуліся наўцёкі. Дваіх удалося затрымаць.

## НАМЯНЯЎ

**Не зразумела, чаму людзі звяртаюцца да валютчыкаў-мянялаў, калі ў абменных пунктах і чаргі няма (ва ўсякім разе ў Баранавічах)?**

Супрацоўнікі міліцыі і дзяржкантролю затрымалі на вакзале «Палескі» жыхара горада, які займаўся абменам валюты. У мянялы канфіскавалі 9 млн рублёў, 2550 еўра, 6000 расійскіх рублёў, долары.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## «ГАРАЧЫ» 287 17 41 «РАБОТНІК ПРЫЛАЎКА АБАВЯЗАНЫ КАНСУЛЬТАВАЦЬ ПАКУПНІКОЎ...»

**У рэдакцыю патэлефанавала мінчанка Ірына Атрушкевіч, якая сутыкнулася з наступнай праблемай. «У краме хацела набыць у падарунак кухонную бляху вытворчасці Германіі. Быў нават выбар — з рашоткай ці без яе. Спытала ў прадаўца, для чаго прызначана рашотка, як ёй карыстацца (гэты выраб каштаваў больш). Тая адказала, маўляў, паколькі я сама дома не гатую, дык не ведаю. Бляху з рашоткай я ўсё ж купіла. А потым задумалася над словамі прадаўца. Ці мела яна рацыю? Што з таго, што асабіста яна дома не гатуе, я не да яе ў кватэру прыйшла, а ў краму? Усё ж нейкую больш падрабязную інфармацыю пра тавар, лічу, работнікі прылаўка пакупнікам павінны даводзіць...»**

На гэты чытацкі запыт мы папрасілі даць адказ кансультанта ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Антаніну Палякову.

— Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» вызначаны агульныя патрабаванні да аб'ёму і спосабу прадастаўлення інфармацыі пра тавар. У прыватнасці, да ведама спажыўца даводзяцца звесткі пра найменне тавару, цану, гарантыйны тэрмін (калі ён вызначаны), дату вырабу і (ці) тэрмін службы, найменне (фірмовае найменне), месца знаходжання (юрыдычны адрас) вытворцы (прадаўца), спажывецкія якасці тавару, іншыя звесткі, якія, у адпаведнасці з заканадаўствам ці дагаворам, абавязковыя для прадастаўлення, — сказала Антаніна Васільеўна.

Дадатковая спецыяльная інфармацыя пра тавар (акрамя ўказанай), што характарызуе якасці тавару, зыходзячы з яго спецыфікі, вызначаецца ў адпаведных тэхнічных нарматыўных прававых актах (дзяржаўных стандартах, тэхнічных умовах). Аднак калі такія дзяржаўныя стандарты, тэхнічныя ўмовы адсутнічаюць, такая дадатковая інфармацыя пра тавар можа давацца вытворцам.

— Інфармацыя даводзіцца да ведама спажыўцоў у дакументацыі, што дадаецца да тавару, на спажывецкай тары (упакоўцы) ці іншым спосабам, прынятым для асобных відаў тавараў, — паведаміла далей Антаніна Палякова. — Прадавец абавязаны валодаць звесткамі пра тавар. У адпаведнасці з Правіламі паводзінаў прадаўца, зацверджанымі загадам Міністэрства гандлю ад 4 студзеня 1995 года № 2, работнік прылаўка абавязаны кансультаваць пакупнікоў аб прызначэнні, уласцівасцях, якасці тавараў, правілах іх догляду, цэнах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПРАВЕРКІ МАГЧЫМЫХ ФАКТАЎ НЕАБГРУНТАВАНАГА ПАВЕЛІЧЭННЯ ЦЭНАЎ БУДУЦЬ ПАДОЎЖАНЫ?

Замест ранейшага штомесячнага маніторынгу цэнаў на пэўны асартымент харчовых тавараў, у тым ліку плодаагароднінную прадукцыю, Міністэрства гандлю цяпер будзе праводзіць штотыднёвыя такія праверкі. А, улічваючы факты парушэння правілаў гандлю і незахавання цэнаснага заканадаўства, міністэрства звярнулася ва Урад з хадайніцтвам аб падаўжэнні тэрміну правядзення праверак. Як паказалі выбарачныя («кропкавыя») праверкі Міністэрства гандлю, праведзеныя сумесна з Міністэрствам эканомікі, парушэнні выяўлены ў палове праверапых суб'ектаў гаспадарання. У лідарах сярод парушальнікаў — суб'екты гаспадарання недзяржаўнай формы ўласнасці (асабліва — пры рознічным гандлі на рынках).

Прыпынена дзеянне спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) 29 суб'ектаў гаспадарання (Магілёўская і Віцебская вобласці — па 11, Гомельская — 7), 60 суб'ектаў гаспадарання пазбаўлены права ажыццяўлення рознічнага гандлю (г. Мінск — 14, Магілёўская вобласць — 18, Брэсцкая — 12, Віцебская — 6, Гомельская —1, Гродзенская — 9), на разглядзе на пазбаўленне ліцэнзій знаходзяцца 48 матэрыялаў. Вывучаюцца прапановы розных пастаўшчыкоў на аналагічныя тавары з мэтай выяўлення найбольш прымальных адпускных цэнаў. Для канкурэнцыі павялічана колькасць гандлёвых пунктаў па продажы бульбы і плодаагароднінай прадукцыі на рынках.

У міністэрстве напамінаюць: вызначаны ў краіне парадак фарміравання і выкарыстання цэнаў распаўсюджваецца на ўсе суб'екты гаспадарання, незалежна ад формы ўласнасці і падпарадкаванасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Абзац

■ Малаказаводы Віцебскай вобласці затрацілі летась Br1 млрд на закуп тэстаў па выяўленні антыбіётыкаў у сыравіне. Па санітарных правілах малако ад кароў, якіх лячылі антыбіётыкамі, на працягу 5-10 дзён нельга ўжываць і перапрацоўваць, паведамляе БЕЛТА.

■ **У радзільным доме Барысава затрыманы мясцовы жыхар 1988 г.н. з вучэбнай гранатай без запалу. Ён быў п'яны і пагражаў пашкодзіць маёмасць раддома.**

■ Сутыкненне двух МАЗаў адбылося непадалёк ад Гродна. Аварыя здарылася па віне аднаго з кіроўцаў, які не ўлічыў, што дарога слізкая, у выніку чаго аўтамабіль развярнула і вынесла на сустрэчную. Вадзіцель другога МАЗа паспрабаваў пазбегнуць сутыкнення, але гэта яму не ўдалося. Вадзіцель другога грузавіка шпіталізаваны з пераломамі нагі і рэбраў.

■ **У Беларусі ўпершыню пройдуць спаборніцтвы па хуткаснай зборцы кубіка Рубіка. Пераможца турніру, які пройдзе ў Мінску 1 сакавіка, атрымае, па звестках БЕЛТА, усемагчымую падтрымку для ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах «Moscow Open-2009». Узяць удзел у спаборніцтвах можа кожны, хто збірае галаваломку цалкам.**

■ Больш за 200 супрацоўнікаў апарату, аддзелаў і ўпраўленняў Ровенскага гарвыканкама хутка пойдуць у двухтыднёвы адпачынкі за свой кошт, каб зэканоміць сродкі ў гарадскім бюджэце. Такім чынам удасца зэканоміць больш за 1,5 млн грн, якія будуць выкарыстаныя на патрэбы жыхароў Роўна.

■ **Польскі ўрад плануе ўвесці вяртанне падатку на дабаўленую вартасць пакупнікам новых аўтамабіляў. Кансультацыі паміж міністэрствамі па гэтым пытанні плануецца завяршыць да канца сакавіка. Чакаецца, што ПДВ, які ў Польшчы складае 22 %, можа атрымаць назад кожны, хто купіць новае аўто, а старое здасць у металалом. Пры сярэднім кошце новага аўтамабіля каля 15 тыс. долараў можна зэканоміць 3 тыс. долараў.**

## Поўны абзац

■ Маладзечна ў апошні час трымае першынство па ўзроўні самагонаварэння ў Мінскай вобласці, абагнаўшы традыцыйнага лідара — Старыя Дарогі. Пра гэта паведаміў учора на прэс-канферэнцыі начальнік УУС Мінскай вобласці Іван Саўчыц. Сёлета ў Маладзечанскім раёне было канфіскавана 15 тон самагонкі. А ўсяго летась у вобласці ў насельніцтва канфіскавана і знішчана 135 тон самагонкі і 735 тон брагі.

■ **Перад берлінскім судом паўстаў бармэн, які абвінавачваецца ў тым, што дазволіў 16-гадоваму падлетку выпіць больш за чатыры дзясяткі чарак тэкілы, пасля чаго той упаў у кому і праз месяц памёр. 28-гадовы бармэн наліў юнаку не менш за 45 чарак ёмістасцю па 20 грамаў. Прычынай такой празмернасці стаў заклад, у які малады чалавек пайшоў з прыяцелямі — хто выпе больш. Дарэчы, па звестках германскіх медыкаў, за год у краіне было шпіталізавана 23 тыс. 165 падлеткаў з вострым алкагольным ап'яненнем.**

■ Заканадаўчы сход Забайкальскага краю адзінагалосна прыняў 11 лютага статут новага суб'екта федэрацыі на сваім першым у 2009 годзе пленарным пасяджэнні. Пасяджэнне павінна было прайсці на два дні пазней, у пятніцу, 13 лютага, аднак парламентарыі вырашылі не выпрабоўваць лёс. Як патлумачылі ў прэс-службе, дэпутаты прыйшлі да высновы: славутая пятніца, 13-га — не лепшы дзень для такой важнай справы. З гэтай нагоды святар мясцовага сабора ігумен Сімяон заявіў: «Гэта, тым больш на такім высокім узроўні, гаворыць пра выключнае невуцтва ўсяго нашага грамадства. Пра тое, што сучасная культура прасякнутая акультызмам, магізмам, культывуе не разумнае, добрае, вечнае, а нейкія фанатычныя, цемрашальскія думкі».

■ **Міліцыянеры затрымалі ў Маскве жыхарку Чалябінска, якая пракусіла патрульнаму далонь пры затрыманні. На пульт аператыўнага дзяжурнага паступіла паведамленне пра распіццё спіртных напояў і парушэнне грамадскага парадку каля аднаго з дамоў па Ленінскім праспекце. Па словах вартавых парадку, 35-гадовая жанчына была моцна п'яная, пры затрыманні нецэнзурна лаялася, а ў службовай аўтамашыне пры дастаўцы ў райаддзел укусіла сяржанта за далонь правай рукі, пасля чаго той быў дастаўлены ў медсанчасць для абеззаражвання раны. Куслівай жанчыне пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В СОБСТВЕННОСТЬ В г. ГРОДНО

| № лота | 1. | 2. | 3. | 4. | 5. |
|---|---|---|---|---|---|
| Наименование объекта | Земельный участок У-43 | Земельный участок 198 | Земельный участок У-62К | Земельный участок У-69К | Земельный участок У-83К |
| Местонахождение объекта | м-н «Погораны-Кошевники» | м-н «Погораны-Кошевники» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» |
| Площадь земельного участка (га) | 0,1219 | 0,1281 | 0,1148 | 0,1140 | 0,1084 |
| Кадастровый номер | 440100000003004108 | 440100000003002960 | 440100000003004052 | 440100000003004036 | 440100000003004066 |
| Начальная цена продажи (руб.) | 15 500 000 | 15 500 000 | 18 700 000 | 22 000 000 | 20 900 000 |
| Сумма задатка (руб.) | 1 550 000 | 1 550 000 | 1 870 000 | 2 200 000 | 2 090 000 |
| Сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона (руб.) | 2 678 500 | 2 494 700 | 3 509 890 | 3 509 890 | 3 509 890 |

Аукцион проводится с условием: Строительство и обслуживание жилого дома в течении 3-х лет с момента принятия решения горисполкома о передаче участка в частную собственность. Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности. Инженерные коммуникации на земельных участках в м-не «Южный-4» отсутствуют. Компенсация за инженерные коммуникации по лотам № 1 и № 2 производится победителем аукциона.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. ГРОДНО

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена продажи (тыс. руб.) | Сумма задатка (тыс. руб.) | Форма проводимого аукциона | Условие продажи объекта | Срок аренды участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка | ул. Красно-знаменная, 4 | 0,4972 | 440100000001004286 | 286 400 | 28 640 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет станции технического обслуживания автомобилей с мойкой, кафе и магазином сопутствующих товаров* | 25 лет |
| 2. | Право аренды земельного участка | ул. Карского, 2Б | 0,4037 | 440100000001004285 | 167 900 | 16 790 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет станции технического обслуживания автомобилей с мойкой и магазином сопутствующих товаров* | 25 лет |
| 3. | Право аренды земельного участка | ул. Белые Росы | 0,3869 | 440100000002005452 | 160 900 | 16 090 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет станции технического обслуживания автомобилей с мойкой, кафе и магазином сопутствующих товаров* | 25 лет |
| 4. | Право аренды земельного участка | ул. Врублевского | 1,0003 | 440100000002004801 | 588 200 | 58 820 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет двухэтажного здания торгово-развлекательного центра с рынком на 150 торговых мест* | 25 лет |
| 5. | Право аренды земельного участка | пересечение ул. Грандичской – ул. Окрестной | 0,7413 | 440100000002005451 | 233 400 | 23 340 | Аукцион с условием | Строительство в течение 2-х лет торгового центра по продаже стройматериалов торговой площадью до 2500 кв.м* | 25 лет |

** с подробной информацией об условиях строительства объекта можно ознакомится по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30, тел. (0152) 720546.*

По праву аренды земельного участка по ул. Врублевского в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 20.08.2008 г. № 565 по желанию победителя аукциона предоставляется рассрочка платежа.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка**, **4-х базовых величин** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка РБ в течение 10-ти календарных дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) В случае победы на аукционе на право заключения договора аренды победитель обязан оплатить вознаграждение организаторам аукциона в размере 4 % от начальной цены продажи и 5 % от суммы превышения продажной цены над начальной.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

5) Аукционные торги состоятся при наличии не менее 2-х участников по выставленным лотам.

**Аукцион состоится 16 марта 2009 года, в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Заявления принимаются с 12 февраля по 10 марта 2009 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by**

## НЕБЯСПЕЧНАЯ ПЕЧ

У шэсць гадзін раніцы запалаў пяцікватэрны аднапавярховы дом па вуліцы Лясной у Хойніках. Адзін з жыхароў пачуў трэск шыферу на даху і пабудзіў астатніх. Людзі — а

Для сэрца

# ПА ЧАРАЧЦЫ?.. ПА МАЛЕНЬКАЙ!

## *Колькі грамаў паміж прафілактыкай і гібеллю?*

**Паводле шматлікіх даследаванняў, невялікія дозы алкаголю здольны зніжаць рызыку ўзнікнення ішэмічнай хваробы сэрца. Тым не менш, у сучасных рэкамендацыях прыём алкаголю не можа быць уключаны ў мерапрыемствы па прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў на ўзроўні насельніцтва ў цэлым. Спецыялісты развітых краін адзначаюць, што ў адрозненне ад большасці іншых фактараў рызыкі, такіх як курэнне, гіпертэнзія або высокі ўзровень халестэрыну, алкаголь аказвае адмоўнае ўздзеянне на здароўе на адносна раннім этапе жыцця, у той час як яго абарончыя эфекты ў адносінах да сардэчна-сасудзістых захворванняў адзначаюцца на больш познім этапе. Такім чынам, у першую чаргу неабходна надаваць належную ўвагу пытанням зніжэння шкоды, якую алкаголь наносіць здароўю насельніцтва ў цэлым. Спецыялісты сцвярджаюць, што неспрыяльныя наступствы ўжывання алкагольных напояў адбіваюцца не толькі на пэўных групах асобаў, якія пакутуюць ад празмернага ўжывання алкаголю ці алкагольнай залежнасці. Паводле слоў вядучага навуковага супрацоўніка Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія», кандыдата медыцынскіх навук Ігара КАЗЛОВА, многія людзі, якія ўжываюць алкагольныя напоі проста ад нагоды да нагоды, таксама пакутуюць ад праблем, звязаных з алкаголем.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Парушэнні, звязаныя з ужываннем алкаголю, — адзін з кампанентаў групы нейрапсіхічных расстройстваў. У лік апошніх уваходзяць як уласна алкагольная залежнасць, так і вострае ап'яненне, выкліканае празмерна вялікім прыёмам алкаголю.

Найбольш распаўсюджанай формай псіхалагічнай залежнасці з'яўляецца злоўжыванне алкаголем. Не сакрэт, што алкаголь адносіцца да наркатычных ядаў. Як толькі ён паступае ў кроў і пачынае ўздзейнічаць на нервовыя клеткі галаўнога мозгу, то перш за ўсё выклікае парушэнне ўвагі і самаконтролю. Алкаголь дэзарганізуе псіхічны свет асобы, а ў рэшце рэшт прыводзіць да дэградацыі апошняй. У тых, хто злоўжывае алкаголем, назіраецца пагаршэнне памяці, зніжэнне імкнення выкарыстоўваць у рабоце запас ведаў. У такіх людзей прыпыняецца прафесійны рост, збядняецца духоўнае жыццё. Развіваюцца рысы псіхічнай астэніі: зніжаецца актыўнасць, ініцыятыўнасць, нарастае эмацыянальная няўстойлівасць. У цвярозым стане чалавек на пачатку можа пакутаваць ад дакораў сумлення, у яго можа з'яўляцца нават жаданне ўсё змяніць. Аднак гэта тут жа праходзіць. У такіх асобаў развіваецца бездакаснасць, боязь усяго новага, іх раздражняе ініцыятыва і творчая актыўнасць паплечнікаў, яны становяцца зайздрослівымі і нядобразычлівымі да навакольных.

Шэраг даследаванняў сведчыць, што п'янства і алкагалізм наносяць значны матэрыяльны і маральны ўрон грамадству. Тут і захваральнасць, часовая і стойкая непрацаздольнасць, смяротнасць ад неінфекцыйных захворванняў, няшчасных здарэнняў, самазабойстваў. Даследчыкі пераканаліся, што алкаголь — універсальны фактар рызыкі, які негатыўна ўплывае на захваральнасць і смяротнасць. Акрамя таго, арганічныя паражэнні галаўнога мозгу, перыферычнай нервовай сістэмы, хваробы лёгкіх і печані, звязаныя з празмерным ужываннем алкаголю, некаторыя аўтары прапануюць вылучыць у самастойную групу — алкагольных захворванняў, пры якіх алкагалізм — канчатковая стадыя псіхічнай і фізічнай залежнасцяў.

Паводле сучасных ацэнак, ужыванне алкаголю з'яўляецца прычынай 5,5 працэнта ўсіх смяротных выпадкаў і 10 працэнтаў спецыяльнага паказчыка (DALYs), які ўлічвае сумарныя страты здароўя насельніцтва ў Еўрапейскім рэгіёне. Узровень апошняга паказчыка, дарэчы, намнога вышэйшы сярод мужчын. Акрамя таго, алкаголь з'яўляецца найважнейшым фактарам рызыкі смерці і захваральнасці сярод моладзі.

**— Назавіце, калі ласка, захворванні, якія могуць быць справакаваныя ўжываннем алкаголю.**

— Навуковыя даследаванні паказваюць на прычынную сувязь паміж узроўнем ужывання алкаголю і больш як 60 відамі захворванняў і траўмаў. Ужыванне алкаголю з'яўляецца адным з фактараў, які правакуе развіццё і прагрэсаванне артэрыяльнай гіпертэнзіі. Паводле некаторых звестак, пастаяннае ўжыванне больш як 30 грамаў абсалютнага спірту ў дзень можа прывесці да гіпертэнзіі. Прычым асобныя людзі асабліва схільныя да гэтага.

Павышэнне рызыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі пры ўмераным ужыванні алкаголю паказана ў буйным эпідэміялагічным даследаванні сярод 58 тысяч жанчын ва ўзросце 39-59 гадоў. Пры ўжыванні 20-34 грамаў абсалютнага спірту ў суткі назіралася павышэнне рызыкі развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі на 40 працэнтаў, а пры штодзённым ужыванні 35 грамаў і больш — на 90 працэнтаў. Аналагічныя звесткі былі атрыманы падчас 6-гадовага назірання за мужчынамі і жанчынамі ў даследаванні ARIC, дзе было паказана, што прыём звыш 30 грамаў алкаголю ў суткі суправаджаўся павышэннем рызыкі гіпертэнзіі ў жанчын на 20 працэнтаў, а ў мужчын — у 2 разы. Пры аналізе шэрагу фактараў была паказана незалежнасць уплыву алкаголю ад узросту, вагі, фактару курэння, фізічнай актыўнасці, адукацыі і атрымання замяшчальнай гарманальнай тэрапіі ў жанчын. Лічыцца, што дзесьці кожны дзясяты выпадак гіпертэнзіі ў Паўночнай Амерыцы і Еўропе выкліканы ўзроўнямі ўжывання алкаголю звыш 40 грамаў у дзень.

Гэтыя звесткі пацвярджаюцца і даследаваннямі, якія вывучалі наступствы зніжэння ўжывання алкаголю. Высветлілася, што сувязь паміж ужываннем алкаголю і гіпертаніяй не лінейная, J-падобная. Гэта азначае, што самы нізкі ўзровень артэрыяльнага ціску адзначаецца не ў тых, хто не ўжывае алкагольныя напоі, а ў тых, хто ўжывае іх умерана — да 50 мл моцных напояў.

Ёсць некаторыя звесткі аб тым, што ўмеранае ўжыванне можа знізіць рызыку ішэмічнага інсульту, у той час як празмернае ўжыванне можа павялічыць рызыку гемарагічнага інсульту. Пры рэгулярным ужыванні звыш 100 мл алкаголю ў дзень істотна павышаецца рызыка ўскладненняў артэрыяльнай гіпертэнзіі, у першую чаргу інфаркту міякарда і інсульту. Акрамя таго, варта памятаць, што алкаголь аслабляе эфект антыгіпертэнзіўных сродкаў.

Хворым на артэрыяльную гіпертэнзію мужчынам варта рэкамендаваць змяншэнне ўжывання алкаголю да 20-30 грамаў чыстага этанолу ў дзень — 50-60 мл гарэлкі, або 200-250 мл сухога віна, або 500-600 мл піва. Аптымальная доза для жанчын — 10-20 грамаў.

У той жа час вынікі шэрагу даследаванняў апошніх трыццаці гадоў сведчаць аб тым, што ўжыванне алкаголю ў малых або ўмераных дозах асацыюецца са зніжэннем рызыкі развіцця атэрасклерозу і яго ўскладненняў. Высветлілася, што той, хто выпівае ўмерана, мае меншую частату развіцця ішэмічнай хваробы сэрца, чым той, хто поўнасцю ўстрымліваецца. *У 12-гадовым даследаванні з удзелам 38 тысяч медработнікаў мужчынскага полу без сардэчна-сасудзістых захворванняў, было паказана, што пры ўжыванні 15 мл чыстага алкаголю 3-4 або 5-6 разоў на тыдзень рызыка інфаркту была ніжэйшая на 32 і 37 працэнтаў адпаведна ў параўнанні з рызыкай у тых, хто прымаў алкаголь менш за 1 раз у тыдзень.*

У працяглым даследаванні з удзелам 128 тысяч чалавек было выяўлена, што ў тых, хто прымаў алкаголь у дозе 1 або 1-2 дрынкаў у суткі (1 дрынк адпавядае 15 мл чыстага алкаголю, 40 мл моцных напояў, 150 мл віна) рызыка інсульту была ніжэйшая на 30 і 20 працэнтаў у параўнанні з тымі, хто не піў наогул. Пры ўжыванні 3-5 дрынкаў у суткі рызыка не змянілася, а ў выпадку прыёму 6 дрынкаў і больш рызыка інсульту была вышэйшая на 90 працэнтаў.

Адным словам, аналіз вынікаў 25 буйных назіральных даследаванняў, прысвечаных гэтай праблеме, паказаў, што ўжыванне любых спіртных напояў — віна, піва, моцных напояў — у невялікіх дозах можа знізіць рызыку развіцця ішэмічнай хваробы сэрца. Механізмы, якія хаваюцца ў падмурку гэтай спрыяльнай сітуацыі, усё яшчэ канчаткова не ўстаноўленыя. Гіпатэтычна разглядаюцца тры найбольш верагодныя механізмы спрыяльных эфектаў малых і ўмераных доз алкаголю. Першы звязаны з павелічэннем у плазме крыві канцэнтрацыі халестэрыну, ліпапратэінаў высокай шчыльнасці і з антыаксідантным эфектам у адносінах да ліпапратэінаў нізкай шчыльнасці. Другі звязаны са змяншэннем схільнасці да тромбаўтварэння. Трэці — са здольнасцю малых і ўмераных доз зніжаць псіхаэмацыянальнае напружанне.

**— А якім чынам варта разглядаць уздзеянне алкаголю на хворых з ішэміяй?**

— Яшчэ ў 80-х гадах кардыёлагі рэкамендавалі пацыентам з ішэмічнай хваробай сэрца абсалютна ўстрымлівацца ад ужывання алкаголю. У 1998 годзе часопіс «Ланцэт» упершыню апублікаваў вынікі пяцігадовага назірання за 5 тысячамі мужчын, якія перанеслі інфаркт міякарда. Было выяўлена, што сярод пацыентаў, якія ўжывалі алкаголь у невялікіх, умераных дозах, смяротнасць ніжэйшая, чым сярод тых, хто не ўжываў яго наогул.

У іншым даследаванні было паказана, што ўмеранае ўжыванне алкаголю сталымі людзьмі суправаджалася зніжэннем рызыкі развіцця сардэчнай недастатковасці на 21 працэнт пасля кантролю іншых фактараў рызыкі. У сувязі з магчымым паляпшэннем прагнозу ў пацыентаў з хранічнай сардэчнай недастатковасцю малое або ўмеранае ўжыванне алкаголю дапускаецца ў сучасных рэкамендацыях па лячэнні згаданай хваробы.

Вось што пісалі летась на гэту тэму замежныя прафесійныя медыцынскія часопісы: «...мы выявілі, што пераход у сярэдзіне жыцця ад устрымання ад алкаголю да яго ўмеранага ўжывання прывёў да істотнага змяншэння сардэчна-сасудзістых падзей...»; «Умеранае ўжыванне алкаголю можа спрыяльна ўздзейнічаць на некалькі аспектаў аддаленага прагнозу пасля вострага інфаркту міякарда. Патэнцыйныя механізмы, якія хаваюцца ў аснове гэтай асацыяцыі, усё яшчэ маюць патрэбу ў тлумачэнні».

*Аднак пры ўжыванні вялікіх доз алкаголю апошні выступае як фактар рызыкі мазгавога інсульту, раптоўнай смерці ад ішэміі і іншых сардэчна-сасудзістых захворванняў.*

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Цікава ведаць

*Выкрадальнікам розуму алкаголь называюць здаўна. Аб своеасаблівых вартасцях спіртных напояў людзі даведаліся дзесьці за 8 тысяч гадоў да нашай эры. Са з'яўленнем керамічнага посуду стала магчымым вырабляць алкагольныя напоі з мёду, пладовых сокаў і дзікага вінограду.*

*Не выключана, што вінаробства ўзнікала яшчэ да пачатку культурнага земляробства. Вядомы вандроўнік Мікалай Міклуха-Маклай назіраў папуасаў Новай Гвінеі, якія яшчэ не ўмелі здабываць агонь, але ўжо ведалі пра выраб хмельных напояў.*

*Чысты спірт пачалі атрымліваць арабы ў 6-7 стагоддзях і назвалі яго «аль-каголь» — той, што адурманьвае. А першую бутэльку гарэлкі вырабіў араб Рагез у 860 годзе. У сярэднявеччы ў Заходняй Еўропе таксама навучыліся атрымліваць моцныя спіртныя напоі шляхам узгонкі віна і іншых цукровых вадкасцяў. Паводле легенды, упершыню гэту аперацыю здзейсніў італьянскі манах, алхімік Валенціўс. Калі ён пакаштаваў самаробны прадукт, то заявіў, што вынайшаў цудадзейны эліксір, які робіць старога маладым, стомленага бадзёрым, а сумнага вясёлым. З таго часу алкагольныя напоі хутка распаўсюдзіліся па краінах свету. На сёння самым высокім узроўнем ужывання алкаголю вылучаецца еўрапейскі рэгіён.*

## Спорт-тайм

### БЕЛАРУС ВЫЙГРАЎ ЛЫЖНЫ МАРАФОН

Шосты этап Кубка свету па лыжных марафонах адбыўся ў Францыі. У мужчынскай гонцы на 76 км вольным стылем перамогу святкаваў беларус Аляксей Іваноў з вынікам 3:40.07. Перамога беларуса стала для многіх нечаканасцю. У 2006 годзе ён быў на турніры другім, а праз тры гады здолеў падняцца на найвышэйшую прыступку п'едэстала.

### СЕРАБРО «ВЯЛІКАГА ШЛЕМУ»

Беларускі дзюдаіст Яўген Бядулін (вагавая катэгорыя да 100 кг) выйграў «серабро» на этапе «Вялікага шлему» ў Парыжы. У паядынку за «золата» наш суайчыннік саступіў японцу Такамашы Анаі. Яшчэ двое беларускіх дзюдаістаў — Мікалай Баркоўскі (81 кг) і Ігар Макараў (звыш 100 кг) — занялі ў Парыжы пятыя месцы. Турніры «Вялікага шлему» — новая серыя спаборніцтваў, якія праводзяцца з 2009 года і прыраўноўваюцца да спаборніцтваў былога Суперкубка свету.

### КАМАНДНАЯ «БРОНЗА»

У венгерскім Будапешце прайшоў этап Кубка свету па фехтаванні на шаблях сярод мужчын. У камандным турніры зборная Беларусі (Дзмітрый Лапкес, Аляксандр Буйкевіч, Валерый Прыёмка) заваявала бронзавыя медалі, узяўшы верх у матчы за 3-е месца над дружынай Італіі — 45:33.

### ХІДЫНК УЗНАЧАЛІЦЬ «ЧЭЛСІ»

Галоўны трэнер зборнай Расіі па футболе Гус Хіддынк узначаліць лонданскі «Чэлсі» на тры месяцы — да канца сезона 2008-2009. Такі варыянт супрацоўніцтва англійскі клуб прапанаваў Расійскаму футбольнаму саюзу, і расійскі бок гатовы прыняць гэту прапанову. РФС пацвердзіў, што на працягу трох месяцаў Хіддынк будзе сумяшчаць работу ў «Чэлсі» і ў зборнай Расіі. Пагадненне Хіддынка з РФС дзейнічае да чэрвеня 2010 года, а аплачвае кантракт фонд «Нацыянальная акадэмія футбола», заснавальнікам якой з'яўляецца Раман Абрамовіч. Англійскі клуб застаўся без трэнера вечарам 9 лютага, калі ў адстаўку быў адпраўлены бразілец Луіс Філіпэ Скалары.


## Уважаемые акционеры ОАО «Белдортехника»

27 марта 2009 г. в 15.00 состоится очередное общее собрание акционеров. Место проведения собрания: г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», актовый зал. Регистрация с 14.30 до 15.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛДОРТЕХНИКА»**

1. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2008 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год и перспективах развития Общества на 2009 год.
3. О результатах проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2008 год.
4. Утверждение годового баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2008 год.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2008 год.
6. Утверждение направления использования чистой прибыли на 2009 год и первый квартал 2010 года.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии, условиях вознаграждения.
8. Об оказании спонсорской помощи в 2009 году.
9. О внесении изменений в Устав Общества.

Ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания можно в рабочие дни (понедельник—пятница) с 14.00 до 16.00 по месту нахождения Общества (г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», комната 312), начиная с 20.02.2009 г.

УНН 100135303 **Наблюдательный совет.**

## ОАО «Минскоблхлебопродукт»

уведомляет, что в связи с принятием на внеочередном общем собрании акционеров ОАО «Минскоблхлебопродукт» 30 декабря 2008 года решения о реорганизации Общества путем присоединения к нему ОАО «Борисовский мясокомбинат», СПК «Большие Новоселки», СПК «Погостский», акционеры, проголосовавшие по вопросу реорганизации Общества «ПРОТИВ» или не принявшие участие в голосовании, имеют право заявить требование о выкупе принадлежащих им акций ОАО «Минскоблхлебопродукт». Цена выкупа акций составляет 140 рублей за одну акцию. Письменное требование акционера о выкупе принадлежащих ему акций должно поступить в Общество не позднее 60 дней с даты принятия общим собранием акционеров решения о реорганизации Общества.

**Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт».**

УНН 600013143 **Тел. 224 19 17.**

## ОАО «Белтрубопроводстрой»

извещает своих акционеров, что выплата дивидендов по итогам работы Общества за 4 квартал 2008 года будет осуществляться по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 129 и почтовыми переводами.

УНП 100364117.

**Справки по тел.: 017 334 30 31, 334 34 74.**


Антыкрызісная эканоміка

# НЕСТАНДАРТНЫ ХОД

**Не сакрэт, што ў падобных фінансава-эканамічных умовах у розных прадпрыемствах засуім не аднолькавы вынік працы. Многае тут залежыць не толькі ад агульнага стану спраў у той ці іншай галіне вытворчасці, аб'ектыўных праблем, але і ад уменя знайсці і задзейнічаць новыя, нестандартныя шляхі выкарыстання вытворчага патэнцыялу на канкрэтных прадпрыемствах.**

Летась на Гродзеншчыне было шмат зроблена, каб удасканаліць дарожна-транспартную сістэму. Не меншыя задачы трэба вырашаць і сёлета, у прыватнасці, па будаўніцтве, рамонце і ўтрыманні рэспубліканскіх аўтамабільных дарог. Плануецца рэканструкцыя ўчастка аўтадарогі Мінск—Гродна з перасячэннем у двух узроўнях у Шчучыне і на яго абходзе. Таксама прадугледжаны будаўніцтва маста праз Нёман на абходзе абласнога цэнтра, рэканструкцыя транспартнай развязкі.

Пры гэтым трэба разумець, што сітуацыя ў дарожным будаўніцтве можа быць не такой спрыяльнай, як летась, калі было шмат аб'ектаў і некаторыя прадпрыемствы летам працавалі ледзь не ў кругласутачным рэжыме. Сёлета дарожна-будаўнічым арганізацыям зусім не гарантаваная дастатковая колькасць буйных заказаў і, не выключана, абвастрыцца канкурэнцыя за права працаваць на тым ці іншым аб'екце. У выйгрышы, хутчэй за ўсё, будзе той, хто і раней не рабіў стаўку толькі на бюджэтнае фінансаванне, а таксама своечасова паклапаціўся аб укараненні ў вытворчасць сучасных тэхналогій.

Скажам, што рабіць, калі заказаў па дзяржаўнай праграме «Дарогі Беларусі» не хапае для таго, каб стопрацэнтна забяспечыць працай усе кадры і тэхніку прадпрыемства? Сітуацыя небезнадзейная. Да прыкладу, РУП «Дарожна-будаўнічы трэст № 6» у пачатку мінулага года даслаў лісты ўсім патэнцыйным заказчыкам, прапанаваўшы свае паслугі па выкананні самых розных відаў работ — добраўпарадкавання, пад'язных шляхоў і г.д. І па выніках года нават самі не чакалі, што ў агульным аб'ёме работы па «іншых заказчыках» складуць ажно каля 43 працэнтаў. Такога паказчыка старажылы трэста не памятаюць. Акрамя таго, трэст атрымаў ліцэнзію на праектаванне і цяпер мае ўласны праектна-каштарысны аддзел, дзе працуюць спецыялісты высокага ўзроўню. 9,7 мільярда рублёў (пры плане 6,4 млрд руб.) летась выдаткавалі на абнаўленне вытворчасці — набыццё экскаватараў, грэйдараў, бульдозераў, аўтакрана... Не пашкадавалі сродкаў і на сучасную ўстаноўку па прыгатаванні бітумных эмульсій для асфальтабетонных пакрыццяў. І ўласныя патрэбы забяспечаць, і, калі будуць лішкі, атрымаюць выгаду ад продажу гэтай прадукцыі іншым. Гэта вытворчасць прайшла сертыфікацыю і цяпер чакае пачатку дарожна-будаўнічага сезона.

Вось такія крокі, пэўна, і з'яўляюцца найлепшымі антыкрызіснымі мерамі. Па выніках мінулага года ў структуры трэста не было стратных прадпрыемстваў. І, не без падстаў спадзяюцца, не будзе і сёлета.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Цэны на алей змяншацца больш не будуць?

Напачатку снежня мінулага года са спасылкай на нашага эксперта — прадстаўніка аднаго з асноўных імпарцёраў сланечнікавага алею ў Беларусь — мы давалі прагноз, што рознічныя цэны на гэты прадукт да вясны будуць зніжацца. Тлумачылася гэта, у прыватнасці, і багатым апошнім ураджаем сланечніку.

Прадказаную тэндэнцыю спажыўцы на свае вочы маглі назіраць увесь апошні час: кошт на алей у рознічным гандлі сапраўды зніжаўся. Аднак, паводле ўсё таго ж прагнозу спецыяліста, ужо ўвесну аналітыкі абяцалі павышэнне цаны.

— Усе перадумовы для гэтага ўжо назіраюцца, — сказаў нам той жа эксперт. — З-за паступовага падаражання сыравіны, ад кошту на якую і залежыць многае, цана на алей пакуль проста спынілася. Недзе напрыканцы сакавіка чакаецца яе павелічэнне. Пакупнікі заўважаць змяненне рознічных цэнаў на прадукт на паліцах крамаў недзе ў пачатку красавіка. Якім яно будзе, сказаць пакуль цяжка — усё ж рынак ёсць рынак. На асартымент гэтыя змяненні, думаю, ніяк не паўплываюць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### І ВЫПІЦЬ НЕ ПАСПЕЛІ

Двое работнікаў Брэсцкага завода «БелАлка» і індывідуальны прадпрымальнік вырашылі пажывіцца прадукцыяй завода. Кралі не адразу, а на працягу тыдня, і вынеслі з тэрыторыі прадпрыемства больш за сто літраў гарэлкі і спірту. Міліцыя выйшла на след несуноў, украдзенае забрала і завяла крымінальную справу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### П'ЯНЫ КІРОЎЦА НАЕХАЎ НА МАЦІ З ДАЧКОЙ

У Мінску кіроўца на «Маздзе» збіў 33-гадовую жанчыну і яе 14-гадовую дачку. Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, аўтамабіль, якім кіраваў нецвярозы 26-гадовы мужчына, рухаўся па праспекце Любімава з боку праспекта газеты «Звязда» ў напрамку вуліцы Бялецкага і на абазначаным нерэгуляваным пешаходным пераходзе наехаў на жанчыну і дзяўчынку. Пацярпелыя былі дастаўлены ў бальніцу з цяжкімі траўмамі. Кіроўца знаходзіцца пад вартай. Між іншым, гэты парушальнік да таго ж быў пазбаўлены права кіравання транспартным сродкам.

**Ігар ГРЫШЫН.**

А на мой погляд...

## «МЫ СПАДЗЯЁМСЯ, ШТО ЎСЕ ЦЯПЕРАШНІЯ ФІНАНСАВЫЯ ЦЯЖКАСЦІ — ЧАСОВЫЯ...»

**Пакрысе ўздзеянне сусветнага фінансавага крызісу пачынае адчуваць на сабе практычна кожны з нас. Недзе гэта ўжо канкрэтныя цэны, што «б'юць» па кішэні, дзесьці — пакуль толькі прадчуванне непазбежных змяненняў у жыцці...**

**Ці сутыкнуліся вы ўжо цяпер з неабходнасцю эканоміць на нечым? Ці сталі больш старанна планаваць свой бюджэт? Якія цэны і на што канкрэтна апошнім часам узрушылі асабіста вас? Ці даводзіцца вам цяпер адмаўляцца ад набыцця тых ці іншых тавараў?**

***Алена САЛАМАХІНА, вёска Нівы Жлобінскага раёна, палявод, маці шасцярых дзяцей:***

— Вядома ж, і сутыкнуліся, і адчуваем. Найбольш адчувальна, на мой погляд, за апошні час падаражэлі газ, святло, квартплата. Заробкі ж самі ведаеце якія ў нас. Напрыклад, за 11 працоўных дзён — а я была ў водпуску — налічылі 137 тысяч рублёў, яшчэ крыху больш за 200 тысяч — адпускных... Выратоўвае ўласная гаспадарка, мы трымаем карову, свіней. Імкнёмся спажываць найперш сваё, балазе, дзеці — і старэйшыя, і малодшыя — дапамагаюць ва ўсім у хатніх клопатах. Хоць і тут часам порцыі даводзіцца ўразаць.

***Юрый СЯРГЕЕЎ, начальнік цэха прыроднага і звадкаванага газу Капыльскага раёна:***

— Вы маеце на ўвазе сямейны бюджэт? Пакуль адназначна цяжка сказаць. Жонка ў мяне на пенсіі, мой заробак пакуль застаўся на ранейшым узроўні. Хоць, калі ўлічыць, як апошнім часам падскочылі цэны, пэўныя карэктывы ў планаванне сямейнага бюджэту, сапраўды, ужо даводзіцца ўносіць. Асабіста мне кінулася ў вочы, як падаражэлі каўбасныя вырабы, імпартная садавіна. Малако, хлеб істотна ў цане не павялічыліся, аднак і гэтыя прадукты пакрысе каштуюць усё больш. Пра камунальныя плацяжы пакуль нічога не скажу, бо «жыровак» з новымі тарыфамі яшчэ не атрымлівалі. Але над будучыняй даводзіцца задумвацца...

***Святлана БЕГУНКОВА, загадчык склада камерцыйнай фірмы, г. Горкі:***

— Найперш падаражэлі прадукты харчавання: рыба, мяса, малочная група. У нас у глыбінцы гэта адчуваецца. Пра каўбасныя вырабы нічога не скажу — мы іх практычна не набываем, зрэдку хіба хочацца свініны ці ялавічыны. Садавіну, гародніну таксама не купляем, бо жывём у прыватным сектары, маем агарод. Трымаем бройлерных курэй — ужо падмацаванне для сямейнага бюджэту. А ўвогуле мы заўсёды эканомілі. Тым больш што наша дзяўчынка вучыцца ў Мінску.

***Анатоль ДАБРАНСКІ, пенсіянер, вёска Шарэйкі Калінкавіцкага раёна:***

— Ведаеце, я асабліва ні на чым не эканомлю: што бачыць вока з прадуктаў харчавання, што хочацца і падабаецца — купляю. Магу сябе, напрыклад, і нечым салодзенькім парадаваць. Я інвалід з дзяцінства, мне маёй пенсіі хапае. Тым больш, што гарэлкі не п'ю, не куру, машыны ў мяне, у якую трэба ўкладваць сродкі, таксама няма. Таму і дазваляю сабе такія вось выдаткі, хоць, вядома ж, на непатрэбнае грошы не аддаю. Зноў жа — свой агарод маю, трымаю курэй, ката і сабаку. А што да планавання ўвогуле — так, планую на перспектыву свой бюджэт. Трэба ж так «падбіць бабкі», каб нешта адкласці да дня народзінаў пляменніцы ці сястры, да якога юбілею што адкласці.

***Святлана КРОТ, знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, вёска Калінаўка Дубровенскага раёна:***

— Мы жывём як і раней: каб выжыць, каб былі грошы на хлеб, даводзіцца эканоміць. Іншым часам не магу дзецям цукерак купіць, старэйшай нешта да школы... Не ведаю, можа цяперашнія цэны на прадукты харчавання і з'яўляюцца нармальнымі, ды толькі не для заробкаў вяскоўцаў. Вельмі істотна падаражэлі, на мой погляд, каўбаса, рыба. Мы хоць і трымаем карову, дзвюх свіней, але тую ж смятану амаль за 4 тысячы рублёў за паўкілаграма мусім купляць, бо сваёй сабраць не атрымліваецца. Здалі цяля разам з іншымі, дык грошай дагэтуль не аддалі, кажуць, што да мая ніхто нічога не атрымае. І такая ж сітуацыя і ў іншых...

***Валянціна ТАРАСІК, галоўны ляснічы Чэрвеньскага лясгаса:***

— Не ведаю нават, ці варта пра гэта гаварыць... Па нашым лясгасе перайшлі на выплату акладаў без прэмій. Эканоміць лясгас — мусіць эканоміць і кожны работнік, змяншаць свае выдаткі. Мы ўсе спадзяёмся, што такая мера — часовая. Нейкіх асабліва рэзкіх скачкоў цэнаў я не заўважыла. Можа, таму, што маральна была гатовая да такога развіцця падзей. Любое падаражэнне нейкіх тавараў ці паслуг, з якімі мы сутыкаемся, — гэта заўсёды непрыемна, праўда? Аднак тут мы былі ў многім падрыхтаваныя. Прынамсі, шоку не было. Хоць пакуль, да прыкладу, канкрэтных сумаў камунальных плацяжоў мы яшчэ не ведаем.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 25 февраля 2009 года ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**ЛОТ № 1**

**Здание аптеки № 113 с верандой, тамбуром, сараем, калиткой, забором и покрытием из железобетонных плиток, инв. № 340/С-1893 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное здание, общей пл. 73,26 кв.м, стены блочные обложены кирпичом, перекрытия – деревянные, год постройки – 1986.

**Местонахождение:** Гомельская область, Лоевский район, дер. Бывальки, ул. Комсомольская, 78.

**Условия использования** – по целевому назначению или при перепрофилировании для обслуживания жилого дома.

**Земельный участок – 0,0628 га. Срок аренды земельного участка 20 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 58 852 510 руб., в т.ч. имущества – 58 848 410 руб., право заключения договора аренды земельного участка – 4 100 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 2 500 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – Гомельское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 75, тел. (0232)40 09 94; права заключения договора аренды земельного участка – Лоевский районный исполнительный комитет, г.п. Лоев, ул. Ленина, 2, тел. (02347)4 22 34.

**ЛОТ № 2**

**Здание аптеки № 135 с пристройкой, тамбуром, сараем, уборной, калиткой и забором, инв. № 340/С-1891 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное здание, общей пл. 83,4 кв.м, стены кирпичные облицованы плиткой, перекрытия – деревянные, год постройки – 1980.

**Местонахождение:** Гомельская область, Лоевский район, дер. Переделка, ул. Пионерская, 5.

**Условия использования** – по целевому назначению или перепрофилирован для обслуживания здания магазина (кафе).

**Земельный участок – 0,1653 га. Срок аренды земельного участка 20 лет.** Ограничения в использовании – водоохранная зона р. Днепр вне прибрежной полосы.

**Начальная цена единого предмета аукциона – 26 724 064 руб., в т.ч. имущества – 26 713 274 руб., право заключения договора аренды земельного участка – 10 790 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 1 000 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – Гомельское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 75, тел. (0232)40 09 94; права заключения договора аренды земельного участка – Лоевский районный исполнительный комитет, г.п. Лоев, ул. Ленина, 2, тел. (02347)4 22 34.

**ЛОТ № 3**

**Капитальное строение, инв. № 332/С-17226 и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** здание административно-хозяйственное (контора), общей пл. 240,2 кв.м, стены сборно-щитовые обложены кирпичом, перекрытия – деревянные, кровля шиферная, год постройки – 1975.

**Местонахождение:** Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, пос. Червоное.

**Условия использования** – может быть использовано под открытие производств, под объекты социально-бытового, торгового назначения.

**Земельный участок – 0,0681 га. Срок аренды земельного участка 25 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 15 048 034 руб., в т.ч. имущества – 14 830 868 руб., право заключения договора аренды земельного участка – 217 166 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 600 000 рублей.**

**Продавец**: имущества – ПРУП «Строительно-монтажный трест «Белтопливострой», пос. Колодищи Минского района, ул. Чкалова, 51, тел. (017)508 02 93; права заключения договора аренды земельного участка – Житковичский районный исполнительный комитет, г. Житковичи, ул. Энгельса, 4, тел. (02353)2 20 85.

**Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны (0232)74 90 27, 70 14 72.**

**Аукцион проводится 25 февраля 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, 5 этаж, каб. 501 .**

**Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 20 февраля 2009 г.** заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка за участие в аукционе, на счет организатора аукциона, указанный в извещении; нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

**Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» № 3642927330048 в филиале № 300 АСБ «Беларусбанк» г. Гомель, код МФО 151501661, УНН 400243904. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина

## Інфарм-укол

### ГЭТА ІНФАРКТ?

**Калі вы адчуваеце адзін з пералічаных ніжэй сімптомаў, выклікайце «хуткую дапамогу».**

- Моцны, няспынны боль у грудной клетцы, які часта апісваецца як моцны ціск пад грудной косткай. Боль можа выходзіць за межы грудной клеткі, распаўсюдзіцца на левае плячо і руку, абедзве рукі, спіну і нават зубы, сківіцу і шыю. Часам боль у канечнасцях можа з'явіцца без болю ў грудзях. Бывае, боль з'яўляецца ў верхняй частцы брушной поласці і больш падобны на моцнае нетраўліванне. Боль можа з'явіцца раптоўна або паступова нарастаць.
- Ванітаванне і рвота.
- Задышка.
- Моцнае потаадзяленне.
- Слабасць, нецярплівасць і неспакой.

Часам адзінай прыкметай бывае страта прытомнасці.

### ХАТНЯЯ АПТЭЧКА

**Заўсёды сачыце за тым, каб ваша аптэчка медыцынскай дапамогі была добра ўкамплектаваная. Трымайце там асноўныя прадметы:**

- марлевыя павязкі або вільготныя сурвэткі;
- вату;
- шчыпчыкі;
- тэрмометр;
- аспірын (для выпадкаў болю ў грудной клетцы);
- ібупрафен або парацэтамол (для выпадкаў болю і гарачкі);
- антысептык (напрыклад, перакіс вадароду);
- мазь-антысептык;
- мазь з гідракартызонам (ад укусаў);
- бінты;
- пластыр;
- вострыя нажніцы;
- кіраўніцтва па аказанні першай дапамогі.

Нядрэнна мець пад рукой антыгістамінныя таблеткі, антацыды, лекі ад паносу і дадатковыя запасы лекаў. Калі хто-небудзь з вашай сям'і дрэнна пераносіць укусы пчол або іншых насякомых, трымайце дома капсулы з адрэналінам і шпрыцы.

### НЕВЯЛІКІ АПЁК

**Патрымайце месца апёку 15 хвілін пад струменем халоднай вады. Калі такой магчымасці няма, пагрузіце ў халодную ваду або накрыйце яго халодным кампрэсам.**

Як толькі апёк ахаладжаны, выкарыстайце ласьён або ўвільгатняльнік, каб змякчыць месца апёку і папярэдзіць высыханне скуры. Ні ў якім разе нельга мазаць абпаленую скуру алеем. Ён затрымлівае цяпло і можа нанесці яшчэ большую шкоду. Накрыйце апёк стэрыльнай марлевай павязкай. Абвяжыце яго, але не зацягвайце павязку. Яна абмяжуе доступ паветра да апёку і суцішыць боль.

Калі з'яўляюцца напоўненыя вадкасцю пухіры, — не пратыкайце іх. Яны папярэджваюць занясенне інфекцыі. У выпадку, калі пухіры лопнуць самі, прамыйце гэту вобласць мылам і вадой, пасля чаго накладзіце мазь-антысептык і марлевую павязку.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**Павел СЫРАЕЖКІН: грошы – не на вецер, а на палёт.**

# «ЗОРКІ» ПА-НАД КРЫЗІСАМ

*У каго з папулярных беларусаў фінансы спяваюць рамансы, а каго грашовае пытанне не турбуе?*

**Ужо нават самыя закаранелыя аптымісты не спрачаюцца пра тое, ці дайшоў сусветны фінансавы крызіс да Беларусі — яго праявы мы бачым штодня. Але рэагуюць на гэтыя праявы ўсе па-рознаму: адны мабілізуюцца і пачынаюць эканоміць або шукаць дадатковы заробак, другія азартна лічаць чужыя грошы па прынцыпе «няхай у мяне карова здохне, абы ў суседа — дзве». Асабліва дастаецца папулярным асобам — артыстам і іх прадзюсарам, высокааплатным спартсменам і тэлевядучым. «Сарафаннае радыё» абмяркоўвае: прыйшоў час і «зоркам» зацягнуць паясы — а калі попыт на іх паслугі зменшыцца і заробкі ўпадуць, то і на завод пайсці… Цікава, што на гэты конт думаюць самі «зоркі»?**

Наколькі эканамічны крызіс умяшаўся ў іхняе жыццё і паўплываў на творчасць, расказалі «Звяздзе» некаторыя папулярныя беларусы.

— Натуральна, яшчэ перад Новым годам у людзей быў лёгкі мандраж, а ўлічваючы тое, што снежань для артыстаў — самы «хлебны» месяц у сэнсе карпаратывы, мы апасаліся змяншэння колькасці заказаў, — расказвае **ўдзельнік гурта «Чук і Гек» Павел СЫРАЕЖКІН.** — Таму крыху скінулі цану за выступленні і ў выніку ўзялі колькасцю — у зароблennай суме нічога не згубілі, нават выйгралі. Увогуле, я не сказаў бы, што нашы заказчыкі вельмі ўжо імкнуліся эканоміць.

Такім чынам, сядзець без работы гурту не давялося, але адкладваць заробленыя грошы на чорны дзень ніхто не збіраўся:

— Я неяк бачыў па «Еўраньюс» цікавы сюжэт, апытвалі жыхароў розных еўрапейскіх краін напярэдадні святаў: калі б у вас было 100 еўра, што вы з імі зрабілі б ва ўмовах крызісу? Так вось заходнія еўрапейцы адказвалі: невялікую суму можна патраціць на падарункі блізкім, а ўсё астатняе — адкласці. А ўсходнія еўрапейцы, славяне, наадварот прапаноўвалі: 90 еўра — на падарункі і адпачынак, а што застанецца, тое можна адкласці. Вось і я, паводле славянскага менталітэту, патраціў ганарары на сябе любімага, — смяецца Павел. — Адправіўся адпачываць на выспу Ла Гамера (Канарскі архіпелаг). Я чалавек, які лёгка захапляецца ўсім новым і экстрэмальным — з парашутам скачу (12 скачкоў ужо зрабіў), на сноўбордзе катаюся… Падумаў, што не хапае толькі правоў на кіраванне самалётам. І якраз так сталася, што там была такая магчымасць!

Каб атрымаць лётнае пасведчанне, патрэбны быў пілоцкі мінімум — 60 налятаных гадзін з інструктарам і 10 без яго. Допуск да самалёта ўвогуле цяжкасцяў не выклікаў: некалькі элементарных тэстаў на фізічную прыдатнасць і рэакцыю, медыцынская даведка, веданне англійскай мовы, узрост большы за 21 год і, безумоўна, чэк аб аплаце курсаў (у залежнасці ад колькасці ўрокаў — 1800—2300 еўра). «Аднаматорныя самалёты — гэта самы просты клас, прыкладна як у аўтамабілістаў катэгорыя А, кіраванне матацыклам, — дзеліцца ўражаннямі Павел. — Тым больш, я раней ужо сядзеў за штурвалам — з сябрамі спрабаваў сябе ў ролі лётчыка пад Смаленскам. І ўсё адно, калі ляціш на вышыні ў 4000 метраў і можаш развіць хуткасць да 370 км за гадзіну — адчуванні незабыўныя!».

Экзамены здадзены паспяхова — і цяпер артыст чакае, пакуль на працягу 1,5 месяца ў Еўрапейскім цэнтры малой і грамадзянскай авіяцыі ў Люоне будзе выраблена лётнае пасведчанне, якое потым дасылаецца ўладальніку па пошце. З гэтым пасведчаннем можна браць напракат аднаматорныя самалёты на ўсёй тэрыторыі Еўрасаюза, прычым неабавязкова ляцець далёка — напрыклад, такія аэрадромы ёсць у Вільнюсе.

***— Большасць людзей цяпер імкнецца эканоміць, а ты ў прамым сэнсе выкінуў столькі грошай на вецер… Не шкада?***

— Не шкада абсалютна — жывём жа толькі аднойчы! Я ўжо задумваюся над тым, што ёсць мноства іншых захапленняў — напрыклад, курсы маладых падводнікаў. *(Смяецца.)*

Але не ва ўсіх стаўленне да грошай такое ж лёгкае — як прыйшлі, так і сплылі. **Старшыня МГА «Беларусі КВЗ» Андрэй МУКАВОЗЧЫК** нядаўна з сумам абмовіўся: «Вось, збіраліся ў гэтым годзе абнавіць тэлевізійныя дэкарацыі — яны ўжо старыя і зношаныя, але крызіс… Вырашылі пакуль што адкласці».

***— Як думаеце, доўга цяпер давядзецца чакаць новых дэкарацый?***

— Хто ведае — можа, паўгода, можа, год, пакуль сітуацыя большменш не стабілізуецца.

***— Увогуле, фінансавы крызіс моцна паўплываў на вашы планы?***

— Улічваючы крызіс, мы пайшлі на тое, каб знізіць унёскі для камандаў да сімвалічнай сумы ў 100 тысяч беларускіх рублёў. А ў цэлым — паўплываў, як на ўсіх. Справы з арэндай пакуль не пагоршыліся, і дзякаваць Богу. Мы перайшлі на рэжым уразання пажаданага, але рэчаіснае — засталося з намі.

**Уладальнік святочнага агенцтва «Dinamits» Мікалай ХОЛАД,** ён жа саліст уласнага арт-праекта Коля Дынаміт (у недалёкім мінулым — 5-разовы чэмпіён Беларусі па бодзібілдынгу) таксама адзначае, што крызіс заўважна паўплываў на яго работу:

— Людзі сталі патрабаваць больш танных паслуг, шукаць, на чым бы зэканоміць. Гэта адчувалася яшчэ падчас навагодніх святаў, калі заказы адмяняліся ледзьве не ў апошні дзень — кліенты прыходзілі і тлумачылі, што ў іх цяпер не хапае грошай, прычым я не сказаў бы, што гаворка ішла выключна пра дарагія карпаратывы, па-рознаму было… Цяпер увогуле больш тэлефануюць, цікавяцца, што мы можам прапанаваць, але заказы афармляць не спяшаюцца.

***— Ведаю, у вас у планах быў выпуск новага англамоўнага альбома — яго таксама давялося адкласці?***

— Так, з альбомам, я лічу, трэба крыху пачакаць. Раней мы планавалі яго выпусціць летам, але цяпер не ўдасца, альбо давядзецца шукаць сур'ёзных спонсараў. Магчыма, надумаем перавыдаць папярэдні альбом — запісаць яго наноў і дадаць некалькі англамоўных песень — гэта абыдзецца разы ў 2-3 танней, чым рабіць новы дыск. Паглядзім па сітуацыі.

Калі каму з беларускіх «зорак» і давядзецца эканоміць, то **спявачка Ірына ІТЭЙРА** не з іх ліку. Нават калі абставіны змусяць на пэўны час адысці з шоу-бізнэсу і працаваць не па артыстычнай спецыяльнасці, Ірына — бізнэс-лэдзі, уладальніца салона прыгажосці — не застанецца без справы. Напэўна, таму нават у цяперашняй сітуацыі яна змагла дазволіць сабе каротказярміновы адпачынак у экзатычнай краіне — не забываючыся, зрэшты, лічыць грошы.

Нядаўна Ірына Ітэйра вярнулася з адпачынку ў Малайзіі, а дакладней, з выспы Пенанг, дзе найбольш актыўнае турыстычнае жыццё.

— Больш за ўсё здзівіла вечная цеплыня, — узгадвае Ірына. — Слупок тэрмометра там круглы год паказвае ад 21 да 32 градусаў цяпла, і вада ў моры такая ж цёплая. Мы пабывалі ў запаведніку, дзе адчуваеш сябе як у раі — вакол лятаюць тысячы птушак, паўліны гуляюць па сцежках з распушчанымі хвастамі, матылькі нерэальна прыгожыя пырхаюць… Там можна правесці цэлы дзень і не заўважыць — так хутка ляціць час! А яшчэ я была ў будыйскім храме Чайямангкаларам, дзе знаходзіцца гіганцкая скульптура Буды. Увогуле, малазійцы вельмі набожныя — у кожным будынку ў іх ёсць спецыяльны пакой для задавальнення духоўных патрэбаў.

Зрэшты, акрамя духоўнай ежы, Ірына звярнула ўвагу і на цалкам матэрыяльны аспект: паводле словаў спявачкі, кухня Пенанга адна з лепшых у свеце, усё гатуюць са свежых прадуктаў, і ўсё вельмі танна:



**Ірына ІТЭЙРА: у Малайзіі цікава, цёпла і… танна!**

— Страва, у якую ўваходзіць рыс і морапрадукты, у рэстаране хуткага харчавання абыдзецца вам усяго ў долар! Шыкоўная вячэра з добрым віном (алкаголь там прадаецца толькі ў дарагіх рэстаранах) будзе каштаваць на дваіх 50—70 долараў.

Увогуле, паводле назіранняў Ірыны Ітэйры, самай дарагой часткай падарожжа ў Малайзію былі авіябілеты (улічваючы, што пералёт доўжыцца 20 гадзін з перасадкамі), а ў цэлым адпачынак у гэтай краіне таннейшы, чым у «звыклых» Турцыі і Егіпце. «Ва ўсякім выпадку, пражыванне ў атэлі каштавала ў 2-3 разы танней, і ў плане камфорту ў іх ёсць чаму павучыцца», — запэўнівае спявачка.

…Чым далей распытваеш у зорак пра «крызіс», тым больш мацнее адчуванне, што мы з гэтымі людзьмі жывём у нейкім паралельным свеце — яны не чуюць, не заўважаюць, не адчуваюць. «Крызіс? Ну і што. Ганарары ў нас не ўпалі, і выступленне каштуе дорага», — заўважае, напрыклад, **прадзюсар Пятра Елфімава Таццяна КАСМАЧОВА.** Літаральна некалькі выканаўцаў адклалі на няпэўны тэрмін здымкі сваіх новых кліпаў, але сцвярджаюць, што гэта часовыя цяжкасці, і каментаваць свае творча-фінансавыя праблемы адмаўляюцца. І гэта ў той час, як іх расійскія калегі «скідваюць» са сваіх ганарараў па 20—30 працэнтаў (а калі не скідваюць, ім хутка знаходзяць замену, у тым ліку і з дапамогай беларускіх артыстаў). А далёка не бедны тэлеканал НТБ, напрыклад, яшчэ ў студзені абвясціў аб закрыцці некаторых праграм і праектаў — у сувязі з пераходам на рэжым эканоміі.

***— У сувязі з крызісам ці адмаўляліся вы ад вытворчасці якіх-небудзь праграм?***

**— высвятляю ў Ягора ХРУСТАЛЁВА, першага намесніка старшыні праўлення тэлеканала АНТ** (менавіта гэты канал славіцца ў Беларусі найбольш дарагімі забаўляльнымі і музычнымі шоу).

— Не, пакуль што мы сваіх планаў не мяняем і рухаемся тым жа курсам, што і раней. Тым больш, што чагосьці празмерна дарагога не чакаецца. Летась, напрыклад, АНТ праводзіў вельмі дарагі праект — нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь», але ён праводзіцца раз на два гады… Сёлета мы распачалі некалькі іншых маштабных праектаў — конкурс «Песні маёй краіны», адбор вакалістаў у Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь. Натуральна, будуць яшчэ некаторыя прэм'еры.

***— Дык што атрымліваецца, крызіс для АНТ не адчувальны?***

— Ну, чаму ж. Крызіс на нашай працы, безумоўна, адлюстраваўся, бо мы наўпрост залежым ад рэкламы, а ў многіх рэкламадаўцаў цяпер няпростая сітуацыя. І ўсё ж ні ад якіх праектаў АНТ адмаўляцца не збіраецца.

Міжволі прыходзіш да высновы, што пакуль адна частка насельніцтва засяроджваецца на чаканні і абмеркаванні найгоршых наступстваў крызісу, другая заўзята працуе, спрабуючы нічога не згубіць і не страціць. Але найвышэйшы пілатаж, відаць, — уменне ў крызіс зарабляць. Як гэта ўдалося зрабіць, напрыклад, вядомаму **дызайнеру Уладзіміру ЦЭСЛЕРУ.** Яго прыдумка — напісаны жоўтымі літарамі на чорным фоне слоган «Merry Crisis» («Шчаслівага крызісу!») — спачатку ўпрыгожвала кніжную вокладку аналітычнага выдання, потым — калядныя паштоўкі, а цяпер красуе на фірмовых майках. Прычым майкі гэтыя карыстаюцца вялікім попытам і за межамі Беларусі — нават сярод тых, хто робіць выгляд, быццам крызісу зусім не заўважае.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## У суседзяў

# ЯГО ДАБІВАЛІ РЫДЛЁЎКАМІ…

*Як крымінальная справа набыла палітычную афарбоўку*

**Польшча ўзрушана чарговым гучным скандалам, які разгарэўся ў самым пачатку года. Нядаўна сышоў у адстаўку міністр юстыцыі, ён жа Генеральны пракурор Збігнеў Цвёнкальскі, які крыху больш за год працаваў на гэтай пасадзе ва ўрадзе Дональда Туска. Адной, хоць, магчыма, і не самай галоўнай, нагодай адстаўкі стала самазабойства ў турме злодзея і бандыта Роберта Пазіка, нядаўна асуджанага на пажыццёвае зняволенне.**

Гэты факт можна было б спісаць у разрад руцінных здарэнняў у пенітэнцыярнай сістэме, калі б не адно «але». Справа ў тым, што ў гэтай жа турме ў горадзе Плоцку, дзе сядзеў Пазік, такім жа спосабам, з дапамогай пятлі з прасціны звёў свае рахункі з жыццём у красавіку мінулага года калега па бандытызме гэтага самазабойцы Славамір Касцюк. А ў чэрвені 2007 года, як называе плоцкае выданне «Газеты выборчай», у камеры папярэдняга зняволення ў горадзе Альштыне яшчэ перад пачаткам судовага працэсу павесіўся Войцэх Франеўскі — завадатар банды, куды ўваходзілі Пазік і Касцюк. Яго лічылі небяспечным злачынцам, таму камера знаходзілася пад манітораванне. Нягледзячы на гэта, яму ўдалося павесіцца на бінце. Следства выявіла, што ў крыві Франеўскага быў алкаголь і парэшткі наркотыку амфетаміну.

І палітыкі, і журналісты, і неабыякавыя грамадзяне не маглі не прыйсці да высновы, што такая серыя самазабойстваў гэтых, з дазволу сказаць людзей, на руках якіх кроў забітага маладога чалавека, якога звалі Кшыштаф Алеўнік, не можа быць выпадковай. Такую выснову падмацоўвалі і СМІ, якія абураліся бяздарным вядзеннем следства па факце выкрадання і забойства…

25-гадовы Кшыштаф Алеўнік быў сынам паспяховага прадпрымальніка. Яго бацька, Уладзімеж Алеўнік, займаецца ў Польшчы мясным бізнэсам. Кшыштаф таксама не сядзеў на шыі ў бацькі, быў суўладальнікам вялікага аптовага склада. Як расказвала газета «Жэчпаспаліта», у той вечар у канцы кастрычніка 2001 года Кшыштаф арганізаваў у сваім доме ў ваколіцах вёскі Дробін вечарыну. Сярод гасцей былі, у прыватнасці, паліцэйскія з Плоцка і невялікага гарадка Серпц. Дзесьці каля 11 гадзін вечара госці пачалі разыходзіцца. Некаторых з іх Кшыштаф развозіў вечарам па хатах. Апошнім, каго ён адвёз дадому, быў начальнік крымінальнага аддзела Плоцкай камендатуры паліцыі. Назаўтра Кшыштаф знік. Бацькі ўбачылі ў яго доме вялізны балаган, сляды крыві. А праз двое сутак бацька пачуў па тэлефоне голас сына: «Тата, гэта выкраданне».

«Хочуць атрымаць выкуп у 300 тысяч долараў», — распавядаў потым журналістам Уладзімеж Алеўнік. — Пазней такіх званкоў было некалькі дзясяткаў. Патрабаванні і інструкцыі зачытваў сын, голас якога бандыты запісвалі на магнітафон. Пачалося расследаванне. Весці такую важную справу даверылі мясцовай паліцыі. Тыя, хто быў на грылі ў Алеўніка, збіралі першыя паказанні, вывучалі сляды злачынства. Праз гады высветліцца, наколькі неахайна яны гэта рабілі.

А для Уладзімежа Алеўніка пачалася самая трагічная паласа ў яго жыцці. Практычна кожныя два дні бандыты званілі яму па тэлефоне і пыталіся, колькі грошай сабрана. Прычым перамовы запісвала на магнітафон не паліцыя, а сям'я скрадзенага. Праз тры тыдні пасля збору запатрабаванай сумы пачаліся выезды з выкупам. Выкрадальнікі паводзілі сябе вельмі асцярожна і кожны раз называлі ўсё новае месца перадачы грошай. Як распавядае сястра Кшыштафа Данута, гульня ў жмуркі цягнулася месяцамі, потым бандыты амаль на год замоўклі, пакуль у рэшце рэшт не загадалі, куды ехаць з выкупам. Пра гэта Алеўнікі паведамілі кіраўніку следчай брыгады — начальніку крымінальнага аддзела Радамскай ваяводскай пракуратуры, якая існавала ў той час.

— Рабіце, што загадваюць, а мы будзем трымаць сітуацыю пад кантролем, — сказаў ён, па словах Дануты.

Разам з мужам яна павезла выкуп: у названым месцы, каля віядука, дзе гарэлі дзве лампадкі, была выкінутыя сумка з грашыма. І вось тут справядліва паўстае першае самае сур'ёзнае пытанне ў дачыненні да дзеянняў следчых. Нягледзячы на абяцанні, паліцыі там чамусьці не аказалася. На словах Алеўнікі ім паведамлялі, што ў выпадковых дакументах не было знойдзена пацвярджэння таго, што хоць бы адна паліцэйская машына выехала ў той дзень на месца перадачы грошай.

**Прыкладна 5 млн злотых, ці па тагачасным курсе каля 2 млн долараў ЗША фактычна раздаў у адчаі бацька за выратаванне сына з палону бандытаў.**

Праз тыдзень бандыты пазванілі, падзякавалі за выкуп і сказалі, што Кшыштаф хутка будзе дома. Ды дзе там… Хлопца пераправілі з падвала дачнага дома ў бетонную студню пад памыйную яму. Але пра гэта стане вядома праз некалькі гадоў.

Бедны бацька тым часам абіваў якія толькі мог парогі, звяртаўся да важных дзяржаўных чыноўнікаў, дэпутатаў сейма, пісаў лісты ў пракуратуру краіны, чарговым міністрам юстыцыі. Але тыя заставаліся глухімі. Напачатку, як і следчая брыгада ў Плоцку, так пазней і пракурор з Варшавы настойліва прытрымліваліся версіі аб самавыкраданні Кшыштафа. Бацьку казалі, што, маўляў, усё гэта прыдумалі яго дзеці, каб такім чынам вывудзіць грошы. Паліцыя чамусьці не рэагавала на самыя, здавалася б, відавочныя сведчанні, якія нібы самі ішлі ў рукі.

Справа ў следстве зрушылася з мёртвай кропкі толькі ў 2005 годзе, калі ёй занялася Альштынская акруговая пракуратура, якая мае вялікі аўтарытэт у Польшчы па разблытванні злачынстваў, звязаных з выкраданнямі людзей. Пяць месяцаў спатрэбілася прафесіяналам, каб патрапіць на след бандытаў. Адзін з нягоднікаў, Славамір Касцюк, расказаў следчым праўду пра адно з самых пачварных злачынстваў, учыненых у Польшчы ў апошнія гады. Пра тое, як прыкавалі Кшыштафа да бетоннай сцяны памыйнай ямы ланцугамі для навязвання каровы, як марылі голадам і рэгулярна збівалі, а потым «супакойвалі» псіхатропнымі сродкамі… Такой жорсткасці маглі б пазайздросціць нават самыя азвярэлыя фашысты.

А праз некаторы час пасля атрымання выкупу, пераканаўшыся, што іх зняволены ўсё яшчэ жывы, Касцюк і Пазік 5 верасня 2003 года выцягнулі яго з ямы і нацягнулі на галаву цэлафанавы мяшок для смецця. Але хлопец упарта не хацеў паміраць. Тады яго дабілі рыдлёўкамі, а труп закапалі ў лесе.

А бедныя бацькі ўсе гэтыя гады спадзяваліся, што Кшыштаф яшчэ жывы. І не задумваючыся плацілі прыватнаму дэтэктыву і згубіўшым усялякае сумленне шматлікім «інфарматарам», якія «стараліся» дапамагчы. Прыкладна 5 млн злотых, г.зн. па тагачасным курсе каля 2 млн долараў ЗША фактычна раздаў у адчаі бацька.

У сакавіку мінулага года акруговы суд у Плоцку аб'явіў прыгавор бандытам. Касцюк і Пазік атрымалі пажыццёвае зняволенне, астатнія восем адмарозкаў былі асуджаныя на тэрміны ад аднаго года ўмоўна да 15 гадоў турмы. Але, лічыць Уладзімеж Алеўнік, кропку ставіць рана. Ён глыбока перакананы ў тым, што ў злачынства ёсць заказчыкі і лічыць, што ў ім замешаны вышэйшыя паліцэйскія чыны і палітыкі. Камусьці, на яго думку, вельмі не хацелася, каб злачынства было раскрыта. «Калі б справу расследавалі належным чынам, сын бы жыў». Што ж, гэты няшчасны чалавек мае ўсе падставы так думаць. І сапраўды, ці не зашмат падазроных выпадковасцяў, пытае Алеўнік-старэйшы.

Пасля самазабойства 19 студзеня чарговага бандыта падобныя пытанні паўстаюць нават у людзей, далёкіх ад следчай практыкі. Як так атрымалася, што пасля двух самазабойстваў не змаглі прадухіліць чарговае, якое зрабіў «найбольш ахоўны вязень у Польшчы»? А можа Пазіку і двум яго калегам-бандытам хтосьці дапамог звесці рахункі з жыццём?

Скандал вакол справы Кшыштафа Алеўніка набыў палітычную афарбоўку. Першай ахвярай стаў міністр юстыцыі Збігнеў Цвёнкальскі, хоць, на думку аналітыкаў, ставіць яму ў віну тое, што адбылося ў польскім правасуддзі, можна з вельмі вялікай нацяжкай. Міністрам ён стаў толькі 16 лістапада 2007 года. Кажуць, што быў не найгоршым служыцелем Феміды. Падобна, маюць месца чарговыя палітычныя разборкі ва ўрадзе, а справа Алеўніка была толькі нагодай.

Цяпер створана следчая камісія сейма па высвятленні акалічнасцяў смерці Кшыштафа Алеўніка і самазабойства яго катаў. Аднак, апазіцыйная газета «Трыбуна» перасцерагае, што камісія можа заняцца не прадметным высвятленнем справы, а стаць чарговымі палітычнымі гульнямі. Як сказаў адзін малады чалавек — удзельнік сустрэчы ў адной з папулярных польскіх тэлепраграм з вядомым юрыстам Анджэем Цолем, ніводная са створаных раней камісій сейма, звязаных з раскрыццём буйных карупцыйных скандалаў у краіне, яшчэ ніколі нічога не высветліла. Можа на гэты раз будзе выключэнне?

…А нядаўна польскія СМІ паведамілі пра яшчэ адзін факт: прарвалася каналізацыя ў складзе альштынскай паліцыі, дзе між іншым, захоўваюцца папкі са следчымі дакументамі па справе Кшыштафа Алеўніка.

**Міхаіл БАЦЯН.**

## Тэлесеткі

### «Гісторыя Перамогі» расказаная напалову

**Цыкл праграм, прысвечаных храналогіі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, выходзіць на Першым канале з канца верасня мінулага года. Праект ужо набліжаецца да сярэдзіны. Цяпер, паведамляе прэс-служба Белтэлерадыёкампаніі, гледачы ўбачылі больш як 130 серый-фільмаў, а ўсяго да паказу запланавана больш як 300.**

Паводле слоў кіраўніка праекта «Беларусь. Гісторыя Перамогі» Юрыя Гроерава, серыя інфармацыйна-гістарычных праграм аднаўляе максімальна поўную храналогію вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, дзень за днём: ад 23 верасня 1943 года (калі быў узяты першы населены пункт — горад Камарын) да 28 ліпеня 1944 года, калі быў вызвалены Брэст.

«У цыкле праграм мы выкарыстоўваем унікальныя архіўныя відэа-, і фотаматэрыялы, — расказвае кіраўнік творчай групы Ягор Марозаў. — Робім і пастановачныя здымкі, паказваем тагачасныя карты перасоўвання і дыслакацыі войскаў — усё дзеля таго, каб стварыць у гледача эфект прысутнасці». Асобная рубрыка праграмы прысвечана ўрыўкам з лістоў і дзённікаў салдатаў Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя дакументы, таксама як асабістыя рэчы герояў праграм, аўтары сцэнарыя знайшлі ў фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Храналагічна кожная праграма расказвае пра адзін дзень вайны, а самі серыі выходзяць на Першым канале тройчы на дзень. Паралельна ідзе работа над чарговымі фільмамі. Паводле слоў Ягора Марозава, плануецца, што апошняя серыя праекта «Беларусь. Гісторыя Перамогі» будзе паказаная якраз 28 ліпеня — у дзень вызвалення Брэста і, па сутнасці, усёй краіны.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.36 | 17.13 | 9.37 |
| Віцебск — | 7.29 | 16.59 | 9.30 |
| Магілёў — | 7.26 | 17.03 | 9.37 |
| Гомель — | 7.18 | 17.04 | 9.46 |
| Брэст — | 7.50 | 17.29 | 9.39 |
| Гродна — | 7.47 | 17.34 | 9.47 |

**Месяц**

*Поўня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Васіля, Івана, Іпаліта, Пятра, Рыгора, Сцяпана.*
***К.*** *Яўлалії, Аляксея, Дзям'яна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## НАДВОР'Е на заўтра




## Дзве даты

## 12 лютага

**1569 год** — у Вялікім Княстве Літоўскім пачаў дзейнасць ордэн каталіцкіх манахаў Таварыства Ісуса (ордэн езуітаў). Асноўнай сваёй задачай ён лічыў барацьбу з Рэфармацыяй, што стала пачаткам контррэфармацыі.

**1941 год** — пачалася практычная рэалізацыя плана Барбароса — масіраванае перамяшчэнне германскіх войскаў да межаў СССР.

## Цытата дня:

***«Віно дрэннае яшчэ і тым, што прымушае нас прымаць словы за думкі».***

**Сэмюэл Джэксан (1709—1784), англійскі пісьменнік.**

# НОЖ

**Прамым прызначэннем нажа было выканнне хатніх спраў — нарэзкі чагосьці, ім вырэзвалі, стругалі, скрэблі і г.д. У той жа час, зроблены чалавекам (выкаваны з металу пры дапамозе агню, молата і накавальні), востры і далёка не бяспечны прадмет хатняга ўжытку традыцыйна лічыўся своеасаблівым абярэгам і дапаможнікам у барацьбе з нячыстай сілай:**

- менавіта нож сяляне выкарыстоўвалі для аховы нехрышчонага дзіцяці. Маці, сыходзячы з хаты, пакідала нож у калысцы, каб нячыстая сіла не падмяніла дзіця, ці не нашкодзіла яму;
- у час пахавання кагосьці з родных, у калыску дзіцяці таксама клалі нож, каб смерць абышла яго;
- кум і кума, накіроўваючыся ў царкву хрысціць дзіця, павінны былі абавязкова пераступіць праз нож, які клалі на парозе, «каб да яшчэ нехрышчонага дзіцяці па дарозе не прычапілася нячыстая сіла»;
- вядома, што маці, якая карміла дзіця грудзямі, абавязкова падкладала пад сябе нож;
- знахары, якія збіралі лекавыя расліны, мелі спецыяльныя нажы — іх выкарыстоўвалі толькі для гэтай справы;
- паўсюдна лічылі, што нельга гуляць з нажом — у той жа дзень у хаце здарыцца сварка;
- калі есці з нажа, будзеш злосным і нястрыманым у выказваннях;
- нельга пакідаць нож, уваткнуты ў хлеб;
- знойдзены нож нельга падымаць і прыносіць дадому — такі нож прынясе ў хату няшчасце;
- катэгарычна забаранялася дарыць нож;
- калі дзяўчына да вяселля дарыла свайму жаніху нож (напрыклад, складны), такое вяселле не ладзілася — з жаніхом здараўся няшчасны выпадак;
- за сталом паміж жаніхом і нявестай ці сямейнай парай не павінен ляжаць нож; лічылася, калі нявеста ў дзень вяселля дакранецца да нажа, то застанецца бясплоднай ці няздольнай нарадзіць здаровае дзіця;
- ніколі не пакідайце на ноч нож на стале. Яго месца — у стале, каб нячыстая сіла не магла яго выкарыстаць. Асабліва гэта правіла тычыцца таго нажа, якім рэжуць мяса і які мае кантакт з крывёю жывёлы.
- Катэгарычна забаранялася браць у рукі нож 11 верасня — у дзень адсячэння галавы Івану Прадцечу.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

— Вой, мілая! Паніроўка гэтых катлет такая хрумсткая сёння! Што гэта?

— Гэта ржа ад патэльні, дарагі. Кажуць, жалеза карыснае для здароўя!

☺

**З дапамогай бутэлькі гарэлкі табурэтка лёгка ператвараецца ў крэсла-гойдалку.**

☺

Сустракаюцца два экстрасэнсы. Адзін — другому:

— Ну, і як у мяне справы?

☺

**Вось і я далучыўся да вядомых людзей: учора жонка шпурнула ў мяне чаравік.**

☺

— А вы ведаеце, чым прынцыпова адрозніваецца жаночы інтэрнат ад мужчынскага?

— У жаночым посуд мыюць пасля ежы, а ў мужчынскім — перад.

☺

**— Дайце бутэльку гарэлачкі, калі ласка.**

**— Мужчына, вы на гадзіннік глядзелі? Гарэлку мы пасля 23.00 не прадаём!**

**— А каб на вас! Ды я гадзіннік прадаў, каб гэтую гарэлку купіць!**



**— Чуеш, сахаты, ты каго тут немясцовым назваў?!**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

**http://**www.zviazda.by;

**e-m